Его Императорское Высочество, Великій Князь *Константинъ Константиновичъ*, родился въ 1858 г., 10 августа (тезоим. 21 мая); супруга Его, Ея Императорское Высочество, Великая княгиня *Елисавета Маврикіевна*, родилась въ 1865 г., 13 января (тезоим. 5 сентября). У нихъ дѣти: Ихъ Высочества: Князь *Іоанъ Константиновичъ*, род. въ 1886 г., 23 іюня (тезоим. 24 іюня); Супруга Его, Ея Королевское Высочество, Княгиня *Елена Петровна*, род. въ 1884 г., 23 октября (тез. 21 мая) У нихъ сынъ Князь Всеволодъ Іоанновичъ, род. 7 янв. 1914 г.); Князь *Гавріилъ Константиновичъ*, род. 1887 г., 3 іюля (тезоим. 13 іюля); Князь *Константинъ Константиновичъ*, род. въ 1890 г., 20 декабря (тезоим. 21 мая); Князь *Олегъ Константиновичъ*, род въ 1892 г., 15 ноября (тезоим. 20 сентября); Князь *Игорь Константиновичъ*, род. въ 1894 г., 29 мая, (тезоим. 5 іюня); Князь *Георгій Константиновичъ*, род. въ 1903 г. 23 апрѣля (тезоим. 23 апрѣля); Княгиня *Татіана Константиновна*, Княгиня Багратіонъ-Мухранская, род. 1890 г. 11 янв. (тез. 12 янв.); въ супружествѣ съ 24 авг. 1911 г., съ Княземъ Багратіономъ-Мухранскимъ. Княжна *Вѣра Константиновна*, родилась въ 1906 г., 11 апрѣля (тезоим. 17 сент.).

Его Императорское Высочество, Великій Князь *Димитрій Константиновичъ*, род. въ 1860 г., 1 іюня (тезоим. 21 сентября).

Ея Королевское Величество, Королева Эллиновъ *Ольга Константиновна*, род. въ 1851 г., 22 августа (тезоим. 11 іюля); была въ супружествѣ съ Его Величествомъ, Королемъ Эллиновъ Георгомъ I.

Его Императорское Высочество, Великій Князь *Николай Николаевичъ*, род. въ 1856 г., 6 ноября (тезоим. 27 іюля), супруга Его, Ея Императорское Высочество, Великая Княгиня *Анастасія Николаевна*, род. въ 1867 г., 23 декабря (тезоим. 22 декабря).

Его Императорское Высочество, Великій Князь *Петръ Николаевичъ*, родился въ 1864 году, 10 января (тезоимен. 29 іюня). Супруга Его, Ея Императорское Высочество, Великая Княгиня *Милица Николаевна*, родилась въ 1896 году, 14 іюля). У *нихъ дѣти*: Ихъ Высочества: Князь *Романъ Петровичъ*, родился въ 1896 году, 5 октября, (тезоимен. 19 іюля); Княжна *Марина Петровна*,

одилась въ 1892 году, 23 февраля, (тезоимен. 23 февраля); Княжна *Надежда Петровна*, родилась въ 1898 году, 3 марта, (тезоимен. 17 сентября).

Его Императорское Высочество, Великій Князь *Николай Михаиловичъ*, родился въ 1859 году, 14 апрѣля (тезоименитство 6 декабря).

Его Императорское Высочество, Великій Князь *Михаилъ Михаиловичъ* родился въ 1861 году 4 октября (тезоименицство 8 ноябра).

Его Императорское Высочество, Великій Князь *Георгій Михаиловичъ* Родился въ 1863 году, 11 августа, (тезоим 26 ноября). Супруга Его, Ея Императорское Высочество, Великая Княгиня *Марія Георгіевна*, родилась въ 1876 году, 30 февраля (тезоименитство 22 іюля). *У нихъ дочери*: Ихъ Высочества: Княжна *Нина Георгіевна*, (родилась въ 1901 году, 7 іюня (тезоимен. 14 января); Княжна *Ксенія Георгіевна*, родилась въ 1903 году, 9 августа (тезоим. 24 января).

Его Императорское Высочество, Великій Князь *Александръ Михаиловичъ*, родился въ 1866 году, 1 апрѣля (тезоим. 30 августа). Супруга Его, Ея Императорское Высочество, Великая Княгиня *Ксенія Александровна*, родилась въ 1875 году, 25 марта, (тезоим. 24 января). *У нихъ дѣти*: Ихъ Высочества: Князь *Андрей Александровичъ*, родился въ 1897 году, 12 января (тезоимен. 30 ноября); Князь *Өедоръ Александовичъ*, родился въ 1898 году, 11 декабря (тезоим. 16 мая), Князь *Никита Александровичъ*, родился въ 1900 году. 4 январяг (тезоим. 24 юня); Князь *Димитрій Александровичъ*, родился въ 1901 году 2 ав уста (тезоименитство 26 октября);Князь *Ростиславъ Александровичъ*, родился въ 1902 г. 11 ноября (тезоимен. 14 марта); Князь *Василій Александровичъ*, родился въ 1907 году 24 іюня (тезоим. 2 августа); Княгиня *Ирина Александровна*, Княгиня Юсупова Графиня Сумарокова-Эльстонъ родилась въ 1895 году, 3 іюля тезоим. 5 мая).

Его Императорское Высочество, Великій Князь *Сергій Михайловичъ*, родился въ 1869 году, 25 сентября (тезоим. 25 сентября).

Ея Императорское Высочество, Великая Княгиня *Анастасія Михаиловна* род. въ 1860 г., 16 юля (тезоим. 22 декабря); была въ супружествѣ съ Его Королевскимъ Высочествомъ Великимъ Герцогомъ Мекленбургъ Щверинскимъ Фридрихомъ-Францемъ.


# Беларуская кнiгарня

**Вiльня, Завальная, № 7.**

Вядзе агульнiцкi i дробны гандэль беларускiмi кнiжкамi, дастаўляе кнiжкi аб Беларусi у другiх мовах, прыймае да друкаваньня рукапiсы.

Кнiжкi беларускiе кнiгарня высылае i накладной платай.

Прыймаецца падпiска на газэты.

Гандлярам Беларуская кнiгарня дае вялiкую уступку.

# Статыстычны аддзел.

## АБ СЬВЕЦЕ.

Часьцей сьвета пяць: Эўропа, Азія, Афрыка, Амэрыка, Аўстралія.

Усяго на сьвецi жыве больш як 1 мільярд 660 мільёноў людзей. Гаворуць яны больш чым на 3 тысячах моў.

Мужчын наагул, больш чым жанок. Сярэдні век людзкі — 33 гады. На 17 гаду жыцьця памірае чацьвёртая часць усіх людзей. Да 65 гадоў дажывае 6 душ с тысячы, а да ста гадоў толькі адна с тысячы.

Людзі усяго сьвету дзелюцца на такіе племёны, або расы: чорная раса; чырвоная раса; малайская раса; жоўтая, або монгольская раса і белая, або каўказкая раса, да каторай прыналежым і мы, беларусы.

Па веры людзі дзеляцца на такіе глаўнейшые веры:

| | | | |
|---|---|---|---|
| Веручых у Хрыста | 534 м. | 940 т. |
| Жыдоўскай веры . | 10 » | 860 » |
| Магомэтанскай . | 175 » | 290 › |
| Буддыйскіх вер. . | 635 » | — |
| Другіх вер . . . | 228 » | 910 » |

На тысячу чэлавек прыходзіцца веручых у Хрыста—135 душ; Буддыйскай веры — 302 душ; Магомэтанскай— веры 110 душ; жыдоўскай веры—7 душ. 446 душ прыпадае на розные другіе веры.

## АБ ЭЎРОПЕ.

У Эўропе жыве усяго 379 мільёноў душ,

| | | |
|---|---|---|
| Славяноў . . . | 106 | мільёноў. |
| Немцоў . . . . | 105 | » |
| Романскаго плем. | 99 | » |
| Вэнгроў . . . | 7 | » |
| Жыдоў . . . . | 5 | » |
| Фінноў . . . . | 5 | » |
| Туркоў і татар . | 5 | » |
| Літвіноў . . . | 4 | » |
| Грэкоў . . . . | 3 | » |
| Келтоў . . . . | 2 | » |
| Альбанцоў . . . | 1 | › |

Баскоў, цыганоў і інш. менш за 1 мільён.

Эўропэйскіе народы вызнаюць найболей хрысціянскую веру. Усяго у Эўропе хрысціян 379 з лішнім мільёноў.

Хрысціян праваслаўнаго звычаю 100 мільён. 25,3 проц.

Хрысціян каталіцкаго звычаю 183 мільён. 46,2 проц.

Хрысьціян протэстанскаго звычаю (*Англіканцоў--23 мільён.,* Лютэранцоў 66 мільён., Кальвінцоў і інш—10 мільён.)—96 мільёноў, 24,2 проц.

У хрысціян уніяцкаго звычаю—6 мільён.

Апрача хрысціян у Эўропе ёсць ешчэ: Магомэтане (Татары і Туркі)—8 м. 2 проц. Юдэйцоў (жыды) 8 м. 2 проц. Полаўцоў 1 м. 0,3 проц

Глаўнейшых гасударствоў у Эўропе 17.

| | | |
|---|---|---|
| Нямеччына | 66,100 | т. ж. |
| Англія | 45,700 | » |
| Аўстро-Вэнгрыя | 50,100 | » |
| Бэльгія | 7,600 | » |
| Боўгарыя | 4,400 | » |
| Данія | 2,800 | » |
| Гішпанія | 20,200 | » |
| Францiя | 39,700 | » |
| Італія | 35,200 | » |
| Норвэгія | 2,400 | » |
| Голяндзія | 6,100 | » |
| Португалія | 6,100 | » |
| Румынія | 7,200 | » |
| Эўроп. Расея і Фін. | 121 800 | » |
| Сэрбія | 2,900 | » |
| Швэція | 5,600 | » |
| Швайцарыя | 3,800 | » |

## АБ РАСЕЙСКІМ ГАСУДАРСТВЕ.

Усіх людзей у Расейскай дзержаві 133 мільёны 592 тысячы душ Усяго жыве ў Рассі больш як 40 розных націй; вось глаўные з іх:

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Вялікарусоў | . 55 | міл. | 668 | тыс. |
| Украінцоў | . . 22 | » | 383 | » |
| Беларусоў | . . 8 | » | 500 | » |
| Палякоў | . . . 8 | › | 159 | » |
| Літвіноў | . . 3 | » | 96 | » |
| Малдавян | . . 1 | » | 145 | » |
| Немцоў | . . . 2 | » | 184 | » |
| Армян і Грэкоў | 2 | » | 190 | » |
| Грузіноў | . . . 2 | » | 442 | » |
| Фіноў | . . . 5 | » | 573 | » |
| Жыдоў | . . . 5 | » | 63 | » |

і другіе.

Хрысьціян у Расеі больш 110 мільёноў, а нехрысьціян—больш 20 мільёноў.

На сто душ у Расеі:

| | |
|---|---|
| Праваслаўных . . . | 69 |
| Стараверoў . . . . . | 2 |
| Армян уніятоў . . . | 1 |
| Каталікоў . . . . . | 10 |
| Лютэран . . . . . . | 2 |
| Жыдоў . . . . . . . | 4 |
| Магомэтан . . . . . | 11 |
| Буддыстоў . . . . . | 1 |

Граматных ў Расеі вельмі мала: на сто душ жыхароў граматных ёсць 16, а неграматных 84.

### С тысячы чэлавек у Расеі займаюцца.

| | |
|---|---|
| Землеробствам . . . | 794 |
| Промысламі . . . . | 82 |
| Торгам . . . . . . | 56 |
| Другімі справамі . . | 104 |
| Наймітоў . . . . . . | 155 |

### Маюць зямлі:

| | | | |
|---|---|---|---|
| менш 5 дзес. | 2 міл. 857 т. | сямей | |
| ад 5 да 8 дз. | 3 міл. 317 | » | » |
| ад 8 › 20 дз. | 4 міл. 807 | » | » |
| ад 20 » 50 дз. | 1 міл. 062 | » | » |
| больш 50 дз. | — міл. 272 | » | » |

---

## АБ БЕЛАРУСІ.

Беларусы перэважываюць сваім числом другіе націі у шасьці губэрнях: Магілёўскай, Мінскай, Віленскай, Вітэбскай, Гродзенскай і Смаленскай. Але апрыч гэтых губэрній, каторые называюцца беларускімі, беларусы жывуць і на другіх губэрнях, жыве беларусоў:

ў Магілёўскай губэрні 1 м. 650 т. 69 душ.
» Мінскай 1 м. 755 т. 690 душ.
» Віленскай 1 м. 76 т. 435 д.
» Вітэбскай 976 т. 638 душ.
» Смаленскай 947 т. 826 душ.
» Гродзенскай 861 т. 640 душ.
› Чарнігоўскай 700 т. душ
» Тверскай 125 т. душ.
» Ковенскай 60 т. душ.

» Пскоўскай 42 т. душ.
» Калужскай 41 т. 29 душ.
» Арлоўскай 38 т. 484 душ.
» Сувальскай 22 т. 390 душ.
» Курляндзкай 20 т. 981 душ.

А ўсяго 8 м. 317 т. 961 душ.

**На сто чэлавек жыхароў:**

| | Беларусоў. | Вялікарусоў і украінцоў. | Жыдоў. | Літвіноў. | Палякоў. |
|---|---|---|---|---|---|
| У Магілёўск. губэрні: | 82 | 5 | 12 | — | 1 |
| У Мінскай губэрні: | 76 | 6 | 16 | — | 2 |
| У Віленскай губэрні: | 56 | 6 | 12 | 17 | 9 |
| У Вітэбскай губэрні: | 53 | 14 | 11 | 17 | 5 |
| У Гродзенск. губэрні: | 44 | 27 | 17 | 2 | 10 |

Па веры беларусы дзелюцца на праваслаўных і каталікоў. Акуратнаго рахунку беларусоў, каталікоў і праваслаўных дагэтуль ніхто не рабіў; меней болей толькі вядома, што беларусоў праваслаўных ёсць блізка ў чатыры разы болей, чым каталікоў.

Беларусы жывуць найбольш па вёсках і належуць да найбяднейшых націй у краю. Палякі на Беларусі—гэта памешчыкі—шляхта, ды малая частка мешчан. Вялікарусы—у Беларусі—гэта чыноўнікі, ваенные і часць стараверoў, каторые працуюць на зямлі. Жыды жывуць па гарадох і мястэчках і становюць торговы стан. Літвіны і Украінцы жывуць у пагранічных часьцях нашаго краю ў перамешку з Беларусамі па сёлах і так сама займаюцца хлебаробствам, як і Беларусы.

# ПОЧТА.

**Перавод грошы на почце.** За перавод трэба плаціць: да 25 рублёў — 15 капеек, больш 25 і да 100 руб.—25 к. Ад 100 да 125 руб.—40 к. і ад 125 да 200 руб.—50 кап.

Калі грошы пераводзюцца па тэлеграфу, трэба йшчэ даплаціць столькі, як за тэлеграму у 20 слоў.

**Сколькі трэба плаціць на почце за перасылку:**

закрытаго пісьма с кожнаго лота . . . . . . . . . . 7 к.
аткрыткі . . . . . . . . . . 3 к.
бандэрольнай пасылкі с кожных 4 лотоў . . . . . 2 к.
за цэнные і грашавые пакеты с кожнаго лота . 7 к.

Пад бандэрольлю можна пасылаць розные друкі, дакумэнты, рукапісі, толькі-б у гэтых паперах не было асабістай перапіскі (прыватнаго лісту) вагой ня больш 4 фунтоў.

**Заказная карэспандэнцiя.** Заказным можна пасылаць ўсякае закрытае і аткрытае пісьмо, а так сама пасылку і бандэроль. На канвэрце з верху трэба напісаць «Заказное» і здаць пад распіску. За заказ даплачываецца 7 капеек.

**Накладная плата.** Заказные пасылкі, закрытые і аткрытые пісьмы і бандэролі можна пасылаць з накладной платай (каб почта узяла і пэрэслала грошы ад таго, хто будзе атрымываць карэспандэнцію ці пасылку). За накладной платай можна пасылаць да 5 тысяч рублёў. Плаціцца да 5 рублёў—10 капеек, а вышэй 5 рублёў за кожны рубель 2 капейкі.

**Плата за тэлеграму.** У межах Эўропэйскай, або Азіацкай Расеі за кожнае слова 5 кап. Калі тэлеграма перэсылаецца з Эўропэйскай Расеі у Азіяцкую ці на адварот, то за кожнае слова плаціцца 10 капеек.

## Такса на пасылкі.

За пасылку трэба плаціць:

| | У I поясе. | У II поясе. | У III поясе. |
|---|---|---|---|
| Да 2 фунтоў . . . . | 25 к. | 35 к. | 45 к. |
| Ад 2 да 7 фунтоў . . | 45 к. | 65 к. | 85 к. |
| Ад 7 да 12 фунтоў . . | 65 к. | 95 к. | 1, 25 к. |
| Калі больш за 12 фунтоў трэба даплаціць с кожнагофунта . | 5 к. | 10 к. | 15 к. |

---

# Чугунка.

За праезд у II класе плата паўтара раза большая, як у III, а ў I — два с палавінай разы большая.

Калі пасажыр, купіўшы білет захочэ ехаць не на тым поездзі, які у білеце назначэны, то павінен заявіць аб гэтым начальніку станціі, бо білет страціць сілу. Начальнік станціі на білеце паставіць штэмпэль. А посьле, ужо калі пасажыру прыдзецца садзіцца на той поезд, які яму патрэбен, ён павінен ізноў заявіць білет у кассе, каб адзначылі, якім поездам пасажыр едзе.

Дзяцей да 5 гадоў можна вязьці дарма, абы толькі не займалі мейсца; с 5 да 10 гадоў плаціцца адна чацьвёртая часць білету.

Кожын пасажыр можэ вязьці з сабой 40 фунтоў багажа дарма.

# Сельска - гаспадарскіе хаурусы (кружкі).

Селянскіе сельска-гаспадарскіе хаўрусы аткрываюцца па нормальнай уставе зацьверджэнай 7 мая 1911 году.

Нормальная устава гэтак кажэ аб мэтах сельска-гаспадарскіх хаўрусоў: «Сельска гаспадарскіе хаўрусы павінны супольнымі сіламі сваіх членоў кіравацца да падняцьця сельскай гаспадаркі, земляробства і даходоў з гаспадаркі, у районе сваей працы.

Каб дайсці гэтай мэты хаўрус павінен:

1) Пазнаць у якім палажэньні знаходзяцца цяпер розные аддзелы сельскай-гаспадаркі і выясьняць патрэбы гаспадарскіе дарогай супольных рад членоў хаўруса над гэтымі справамі, на скліканых, што нейкі час, сабраньнях членоў хаўрусу, на сельска-гаспадарскіх гутарках і зьездах, а такжэ паездках і др.

2) Шырыць паміж людзей сельска-гаспадарскую практыку; навуку пры помачы чытаньня лекцій, кніжэк, газэт і розных сельска-гаспадарскіх друкоў, а такжэ закладаючы сельска-гаспадарскіе школы, бібліотэкі і музэі.

3) Старацца правясьці у жыцьцё найбольш практычные способы гаспадаркі; рабіць пробы над способамі гаспадаркі якіе ужо заведзены па другіх мейсцах, каб, калі што карыснае знайдзецца, завясьці у сваіх членоў закладаць пробные хутары, агароды, сады і друг., і памагаць гэтаму.

4) Памагаць сельскім гаспадаром устраіваць гаспадаркі радай і паказам і прыймаць на сябе факторства на дастаўку розных патрэбных у гаспадарцы рэчэй, а гэтак сама і прадажы сельска-гаспадарскіх прадуктоў, дзеля гэтай мэты закладаць камісіонна-агентурные канторы, сельска гаспадарскіе склады і др.

5) Арганізовываць выстаўкі, таргі і паддзержываць працу і заслугі выказаные у сельскай-гаспадарцы, прызнаючы награды.

У уставе каторая падаецца да губэрнатара у 2 экземплярах, трэба напісаць якую ваколіцу абыймае праца хаўрусу, гэта значэ ці на адну вёску, ці на воласць, або на цэлы павет.

Устава і заяўленьне павінны быць падпісаны 7—10 чэлавекамі, каторые называюцца закладчыкамі.

У селянскіх сельска-гаспадарскіх хаўрусах складкі членскіе назначаюцца невялічкіе, ад 1 руб. да 3 руб. у год.

Нормальную, друкаваную уставу сельска-гаспадарскаго хаўрусу, можна выпісаць ад „Таварыства Падмогі Коопэрацыі“ Вільня, Б. Погулянка 8,11. Инжэнеру А. Шкленніку.

А. Шкленнік.

# ГАСПАДАРКА.

## Як павялічыць даход з гаспадаркі.

Кожны хлебароб, калі хочэ наладзіць сваю гаспадарку так каб яна давала яму большы даход,—каб мець з яе грошы на ўселякіе свае патрэбы, дый не цягацца па чужых краёх, шукаючы заработкаў,—павінен зьвярнуць усю сваю увагу на млечную гаспадарку.

Прадавай карове ўсе свае зямельные прадукты: сумысля засевай для ея розные расьліны, здавай ёй у арэнду сваё поле, садзючы для яе пажыўны корм, як бульба, буракі, морква, а яна табе у дзесяць столак лепш заплаціць і за збажыну, і за арэнду, чым які гандляр.

За апошніе колькі гадоў малако, масла і мяса падскочылі ў цане, бадай, больш, як у два разы. Даўней гарнец малака быў кап. 8—10, а цяпер па гарадох, калі толькі малако пэўнае—печатанае—за кварту гонюць 8 кап. Таксама шалёные цэны і на масла, і на сьметану, і на мяса.

А чаму? Людзей прыбыло па вёсках, а па гарадох—ешчэ больш; бяз млечнаго, ці мяса ніхто ўжо цяпер не абходзіцца, а тымчасам, хоць кароў на агул і прыбыло, але малака і мяса певэдлуг патрэб зьвялічэных—заўсёды нехват. Дык вось да выработкі гэтых дарагіх прадуктоў мы і павінны кіраваць свае цяперашніе гаспадаркі.

Дагэтуль ад кароў сваіх мы ня толькі ня мелі чаго прадаваць, але і для сваей сем'і не хапала малака. Дый ня дзіва. Кароў сваіх марылі голадам праз увесь год. Летам—ганялі мы іх ад 3-яй гадзіны зраньня да 9-ай вечэра па голых выганах; зморыцца толькі скаціна і варочаецца дамоў галодная; зімой—напіхалі нацiональнай (звычайнай) трасяначкай, ад каторай на вясну кароў сваіх прыходзілося падымаць за хвасты. Сорамна нам, дапраўды, так зьдзекавацца над сваей жывёлай!

Шмат хто атказываецца тым, што так рабілі дзяды нашы, дык гэтак раблю і я. Праўда, што дзяды нашы ніякіх траў для скаціны ня сеялі, але ім гэтаго нятрэба было і рабіць: даўней жывёлы было шмат меней, а пашы куды болей, дык скаціна га-

лоднай с поля не прыходзіла. Німа ўжо цяпер ані тых вялізарных абшараў—выганоў, ані тых непраходных лясоў с травой па пояс—перамянілося ўсё, дык і нам прыходзіцца перамяніць даўнейшые спосабы гаспадаркі—на новые—прытасаваные да цяперэшніх варункоў жыцьця.

На гэтые куртатые і голые выганы, мы можэм выпушчаць сваіх кароў толькі прайсьціся—для здароўя, карміць-жэ сваю скаціну трэба з рук, і выпраўляць, і спатыкаць яе з зялёным кормам.

Заместа таго, што цяпер нашы папары валяюцца ня толькі без ніякай карысьці, але нават са шкодай для самой гаспадаркі, бо скаціна, ходзючы па голым бубне, толькі псуе зямлю—ўбівае яе, мы можэм і павінны засеваць на іх розные травы на корм для сваей жывёлы.

Перш-на-перш трэба ў сябе заводзіць канюшыну, каб было што укасіць як найраней з вясны на падкорм жывёлі. Дзеля гэтаго іншые гаспадары засеваюць з восені нават жыто, а вясной гэту рунь косюць на корм каровам. А каб небыло недахвату зялёнай пашы праз усё лета і восень,—с самай вясны ў жыта ўсеваюць сэрадэлю—яна разрастаецца пад восень і можэ трываць ажно да марозоў; на корм сярод лета, так сама што найраней з вясны, сеюць у папары шпэргель (ён скора узрастае); апрача таго ў папары трэба пазасеваць то раней, то пазьней розные мешанкі (гарох, авёс, выку, ячмень і т. п.), мяркуючы так, каб праз ўсё лета быў сьвежы корм для нашай жывёлы.

Трэба толькі памятаць, што ўсе гэтые расьліны можна трымаць на папары толькі пакуль не закрасуюць, а тады ўжо трэба ўсю красуючую мешанку касіць. Бо, калі перэстаіць яна і завяжэ насеньне, то жыто ня будзе такое ўдалае.

На зіму-ж для кароў трэба так сама прызапасіць больш пажыўнаго корму. Дзеля гэтаго павінны мы больш засеваць бульбы, а апрача таго, дзе земля падхадзячая—садзіць кормную моркву (на лягчэйшых грунтах), ці кормные буракі (на грунтах цяжэйшых), і гэтым прыкармліваць свае каровы.

Карова, гэта бытцым машына: мы ёй даем корм, а яна, перэрабіўшы яго, аддае нам малаком. Дык чым больш і сыцейшаго корму мы ёй дадзём, тым болей лепшаго (тлусьцейшаго) дасьць яна нам малака,—тым даражэй, значыцца, яна нам заплаціць.

За граніцай аб гэтым усе людзі перэканаліся ўжо даўно, дык і млечная гаспадарка дае там вялізарные даходы: кожная карова дае ім ня менш 200 рубл. у год. Зродные нам Чэхі, хоць не так даўно ўзяліся каля сваей гаспадаркі, а і то маюць заработку ад каровы 100—150 рублёў.

Латышы, каторых варункі жыцьця шмат былі горшые, чым у нас, бо і зямлі сваей ня мелі, дзякуючы толькі добраму дагляду сваіх кароў, з беднаты дайшлі да багацьця.

Нашы суседзі—польскіе хлебаробы так сама пачалі ўжо кратацца: добра кормюць кароў, закладаюць супольные млечарні

і т. п., і, як на першы пачатак, ня дрэнную ўжо маюць заплату; бо з аднэй каровы выбіраюць чыстага даходу рублёў 50.

Гэткіх заработкоў прапушчаць шкада. Варта было-б, дый пара і нам аб гэтым падумаць.

А. Бэніцэвіч.

---

# Што рабіць, каб гной быу тлусьцейшы.

Ачысьціўшы хлеў ад гною да голай зямлі — застаецца важнае пытаньне: чым-жэ выслаць сам спод хлева?

Разумеецца, тут ідзе гутарка толькі а такіх хлявох, каторых спод ані брукаваны, ані выбіты глінай, ці цэглай, або цэмантам і т. п., словам — у каторых спод — голая земля.

Найбольш вядзецца ў нас такі звычай, што высьцілаюць саломай, бо, як кажуць, пасьля, выбіраючы гной, лепш ён адстае ад зямлі. Высьцілаюць ешчэ дзеля гэтай самай прычыны і яловымі лапкамі.

Як адзін, так і другі спосаб вельмі шкодны для самога гною, бо праз такую падкладку надта лёгка працэджываецца сам клёк і сіла гною — гнаёўка — ў ніз, дзе яе ўцягівае земля, а гной астаецца сухі. А тут якраз уся справа ў тым, каб гэта гнаёўка ані непрападала, бо толькі тады будзем мець тлусты гной.

Іншые гаспадары пробавалі на спод хлеву тоўста насыпаць пілавін, каторых цяпер не так трудна дастаць, бо тартакоў усюды хапае, больш як трэба; але паказалося, што гэта мала памагае, бо праз пілавіны хоць менш, але ўсё-ж гнаёўка працягівае.

Але вось аднаму гаспадару — ці то з розуму, ці то з бяды прышла думка выслаць спод свайго хлева *мяліньням і кастрой* ад лёну і канаплёў.

І што-ж паказалося? На вясну, калі прышлося вывазіць гной, ажно сам гаспадар здзівіўся, што ніколі такога тлустага гною не сабраў, як загэту зіму, хоць скаціну сваю ані крыху ня лепш карміў, як і ў мінулые гады.

А дзіва тут вялікаго німа. Знаная рэч, што кастра і мяліньне зімуючы нават на дварэ, толькі чуць-чуць зьверху нацягне вады, а ў сярэдзіне сухутанька.

Ды ешчэ лепшы маем прыклад на тых стрэхах, каторые латаюць нашы селяне гэтым таварам: дзе ляжыць мяліньня і кастра — вада ані капне.

Значыцца як мяліньня, так і кастра не ўцягівае, не дапушчае да сябе вады. Тое самае зрабілося і ў хлеві: выслаты мя-

ліньням і кастрой спод не дапусьціў у ніз гнаёўкі і яна ўся засталася у гнаі.

Вось і ўся прычына тлустасьці гною.

Кошт і фатыга, як бачым, не вялікіе — варта папробаваць!

**Крук.**

# Аб адлучаньню целят.

Ці гадаваць цялё пры карове, ці зразу яго адсаджываць і паіць,—спорка ідзе здаўна. Каб ведаць, як лепей рабіць, трэба разгледзіць якая карысьць, а якая невыгода пры адным і другім способах гадоўлі моладзі.

Калі цялё астаецца пры матцы, то найважнейшае, што яно мае чыстае і аднастайнаго цепла малако, а гэта вельмі важна для целяці. На некарысць пры гэткай гадоўлі, трэба лічыць: калі карова дужа млечная, а цялё ўдасца не вялікае, дый прагавітае, то не раз бывае, што абасьсецца і хварэе, а такая хвароба іншым разам канчаецца блага. Кожнае недамаганьне каровы адбіваецца і на здароўі целяці. Вельмі трудна адвучыць цялё ад маткі, і пакуль яно само навучыцца добра піць і есьці, праз гэты час марнее. Так сама і карова, пакуль забудзецца дзіцяці, праз доўгі час нуднее і або частку млека затрымлівае, або зусім яго не дае, а гэта так сама адбіваецца і на здароўі і на млечнасьці каровы.

Калі-ж цялё адлучыць ад маткі с першаго-ж дня, не даўшы яму і пробаваць ссаць, то хоць тут не малы клопат з даглёдам, бо трэба пільнавацца, каб малако было чыстае, свежае, аднастайнаго цепла, каб пасуда, с катораго цялё пье, была акуратна гарачай вадой вымыта, але затое цялё зразу вучыцца піць само; можэм самі, зважаючы на яго узрост і патрэбы прыбаўляць, ці зьменьшыць мерку малака; лёгка перайсьці ад чыстаго млека да пойла; скора цялё бярэцца да аўса і сена, і ніякая хвароба каровы, каторая нераз здараецца, не адбіваецца на здароўі целяці.

З гэтаго мы бачым, што там, гдзе гаспадар не жалее свайго заходу і клопоту, выгадней целят адлучаць зразу, чым гадаваць іх пры карові.

Тут ешчэ трэба успомніць а прыпадках, якіе хоць і радзей, але часам здараюцца, калі цялё гадуецца пры матцы.

Бывае, што ні цялё маткі ні матка дзіцяці не забываюцца (хоць ужо адлучано), ажно пакуль і ў поле пойдуць, і тады ўжо праўдзівая беда: то карова ўцекае с поля да целяці, то зноў цялё, дарваўшыся да скаціны, высысае там ня толькі сваю матку, але і другіе спакайнейшые каровы. Гэтак бывае цягнецца ажно да восені, калі ўжо і целяты разам з усей скацінай ідуць у по-

ле. Тады ўжо інакшай рады німа, як трэба прывязываць целяці калючы наморднік (робюць яго або с цьвякаў да гары панатыканых у скурат, або са скуркі вожыка), каторым цялё, калі дабярэцца да вымяні, коліць карові, тады толькі тая адбівае ласуху.

Здарылося мне бачыць і лепшые штукі. Цялё было пры карові два тыдні, пасьля яго зарэзалі на мяса. Карова млека зусім перэстала даваць, а нават даіць не давалася. Чаго-чаго толькі не рабілі—нічога не памагало: карова зарвала, стала мала есьці і худзець. За парадай аднаго старога гаспадара, напхалі скурку зарэзанаго целяці сенам, у ногі паўшывалі калкі і гаспадыня за кожным разам, як йшла даіць гэту знаравіўшуюся карову, брала с сабой пад паху „прыладу", стаўляла ў куце, а карова, мыкаючы і аглядаючыся на яе, як найлепей, што да капелькі, аддавала малако.

Цяпер ешчэ адна справа. Павэдлуг старадаўнаго звычаю, як толькі карова ацеліцца, зараз жэ ідуць здаіваць малодзіва. Калі карова захудаўшая, ня млечная—для яе, разумеецца, ешчэ не вялікая беда, ці крыху пацягаюць за вымя ці не. У каго-ж карова добра захавана, дый млечная, то здаіваць зараз пасьля ацяленьня, ніколі ня сьлед: хай перш цялё сьцягне, а тады ўжо уважаючы, калі канешна патрэба, можна і здаіць.

Бываюць, разумееца, прыпадкі (напр. нежывое цялё), калі хоцькі няхоцкі карову прыйходзіцца даіць, то і тады трэба да гэтаго брацца толькі ў гадзіны 4—5 пасьля ацяленьня, і то лепш не здаіваць зразу да чыста, а па крысе за 2—3 разы. Гэткім парадкам не раз усьцерагчы можна жывёлу ад хваробы, якая частавата падпадае пасьля ацяленьня.

**Гаспадар.**

# Як выбіраць крэпкаго гаспадарскаго каня.

Хіба ніхто ня будзе сьпірацца, што той конь, каторы здацен да цяжкога возу, ня будзе здацен да шыбкай язды; так сама, як конь, каторы ходзіць толькі пад конна, ня згодзен да сахі, —адным словам да кожнай працы патрэбны інакшаго складу і характару конь.

Селяніну патрэбны конь такі, каторы-б мог добра цягнуць саху, ці барану, каб складзен быў да цяжэйшаго возу, дый скора не марыўся-б; конь, значыцца, павінен быць дужы і здаровы, бо толькі такі будзе магчы працаваць карысна у гаспадарцы. Кожны хочэ мець добраго і здатнаго да працы каня, толькі не ўсякі умее яго, купляючы, выбіраць, ды апрача таго, так ужо здаўна вядзецца, што пры куплі, ці прадажы каня стараюцца

адзін другога ашукаць і трэба прызнацца, што ні ў водным гандлю німа гэтулькі ашуканства, як у конскім, дык перш, чым набыць каня, трэба яго добра агледзіць і выпрабаваць.

Аглядаць каня трэба пачынаць з галавы. Галава павінна быць прыстаўлена да шыі наўскось—знізу ў верх; скура на ёй павінна быць ценькая, гладкая—бяз рубцоў. Вочы трэба каб былі чыстые, бліскучые і гэтак сама бяз знакоў і рубцоў. Каб не нарвацца на сляпога каня, найлепш зрабіць такую пробу: няпэўнае вока астаўляюць так, як яно ёсць—аткрытым, а здаровае—завязываюць так, каб конь ім нічога ня мог бачыць. Паклаўшы на дарозе бярвеньні, ці так што якое, каня вядуць гэтай дарогай і калі толькі ён сляпы, то напэўна спаткнецца, ці ўдарыцца нагой, калі-ж вока здаровае, то будзе асьцярожна пераступаць і абмінаць уселякіе перашкоды.

Вушамі здаровы конь, як кажуць, гуляе—стрыжэ г. зн. паварачывае у той бок, аткуль чуваць які колечы шум, ці голас; калі-ж конь зусім не варочае вушамі, то значыцца, што ён глухі; іншы конь праз лад ужо круціць вушамі, то тады трэба добра зьвярнуць увагу на яго вочы, бо ў гэткім прыпадку найчасьцей бывае прычынай слепата каня на адно, а то і на абодва вокі.

Шыя да самай тушы (тулава) павінна быць прыстаўлена наўскосць, бо калі яна будзе дужа задзёрта высока, то конь напэўна будзе часта спатыкацца і валяцца. калі-ж шыя нараўні еа спінай, то такі конь скора морыцца. На шыі не павінна быць ніякіх знакоў, ці рубцоў; асабліва трэба добра глядзець пад грывай.

Грудзі трэба агледаць с пераду і з боку. С пераду грудзі будуць крэпкіе тады, калі яны шырокі і на іх німа ніякіх знакоў, асабліва ад хамута; з бакоў агледаюць грудзі так: становюцца с пераду каня, блізка галавы, і калі глядзець ўдоўж каня, то грудзі павінны закрыць жывот. Мейсцэ, на каторым ляжыць хамут-холка павінна быць крыху вышэй, як сама крыжавіна у коней, а ў кабыл — можэ быць і на аднэй лініі; апрача таго, холка павінна быць доўгая і ня дужа вострая, бо шакж ад хамута коні лёгка заціраюцца і лячыць іх прыйдзецца доўга.

Сьпіна ў коней, празначэных да цяжкой працы—вялікаго значэньня ні мае, затое на паясніцу і крыжавіну трэба добра зьвярнуць увагу. Паясніца павінна быць доўгая, з раўком на сярэдзіне, а з бакоў—як два крэпкіе валкі—павінны ісьці мускулы. Тое самае трэба сказаць і аб крыжавіне:—адным словам як паясніца, так і крыжавіне павінны быць доўгіе і с крэпкімі, тугімі мускуламі, а гэта дзеля таго, што пры цяжкой працы каня, яму прыходзіцца куды больш налегаць на задніе ногі, чым на пярэдніе. Вось чаму конь, пасьля працы, аддыхаючы, стаіць на абедзьвёх пярэдніх нагах, а задніе—што раз пераменівае: с правай нагі на левую, то з левай—на правую.

Добра трэба аглядаць у каня ногі, а на самперш звярнуць увагу на іх паставу. Пастава ног лічыцца добрай тады, калі ногі

стаяць роўна адна да другой (паралельна), а між пярэднімі капытамі аставацца будзе мейсца столькі, колькі займае шырыня самога капыта, між задніх-жэ капытоў мейсца свабоднаго павінна аставацца ешчэ менш. Пярэдніе часьці капыта (зачэпы) і задніе—пяткі, не павінны ані прыбліжацца да сябе, ані разыходзіцца ў бакі. Калі глядзець на каня з галавы, то пярэдніе ногі—павінны закрываць задніе. Апрача таго, трэба ешчэ правесьці каня сперша крокам, а пасьля прагнаць добрым трухам і ўважаць, ці не паднімае ён за лішне высока свае ногі, ці хоця-б адну нагу—асабліва—задніе; ці не засекае—г. зн., ці ня бье пярэдняй нагой (падковай) аб пярэднюю, або зацняй—аб заднюю, ці не куе—т. е., ці ня бье пярэдняй часьцяй задняй нагі (зачэпам) у пятку—пярэдняй, бо ад гэтаго робюцца раны, каторые ня скора зажываюць.

Аглядаць самые ногі трэба добра, пачынаючы сперша ад капыта. Рог на капыце павінен быць гладкі, бліскучы, без ніякіх бугорчыкоў, ці наростаў, бо ўселякіе гузочкі на капыце—справа падазроная: былі, значыцца, а то і цяпер ешчэ ёсць (толькі залечэны) нейкіе хваробы, а ад гэтаго сам рог такім робіцца крохкім, што нельга будзе падкаваць каня.

На нагах, вышэй капыта, не павінна быць ніякіх знакоў, ці рубцоў, а найбольш трэба асьцерэгацца гэтаго на ўсярэдняй старане нагі, бо гэткіе знакі найчасьцей астаюцца пасьля лячэньня такіх хвароб, каторых зусім вылечыць нельга, а толькі можна падлечыць, дык праз нейкі час конь ізноў пачне ешчэ горш хварэць.

Самые ногі ў каня, калі яго набываць да цяжэйшай працы, павінны быць кароткіе і тоўстые; калі-ж конь празначэны да лягчэйшай работы і на паяздушкі—то ногі павінны быць тонкіе і доўгіе.

Хочучы захаваць сілу каня, ня трэба яго браць да цяжэйшай работы раней, пакуль ня скончыць пяці гадоў.

К. Сініцкі.

# Як гадаваць насеньня варыва.

Прышоў месяц кастрычнік — пара выбіраць варыва з гароду. Кожная добрая гаспадыня павінна аб тым падумаць, каб было чым засеяць гарод на другі год.

Купляць з году-ў год насеньня — дорага каштуе, апрыч таго нераз бывае, што купіць гаспадыня насеньне на рынку, або ў якой колечы краме, засее гарод, ды нічога ня ўзойдзе, бо, купляючы яго з няпэўных рук, можна нарвацца на старое, ні на што нягоднае насеньне, каторае можэ ўжо гадоў з дзесяць пэраваляюся у прадаўца. А бывае ешчэ і так, што купляюць на-

сеньня і плацюць добрые грошы нібыто за нейкае заводнае, а тымчасам, калі і абойдзе,—то нейкая дзіч.

Набыўшы няпэўнае насеньня, ня толькі выкінем дарма грошы, але прападзе ўся наша праца і напрасна займем найлепшае мейсца ў гародзе, каторы павінен даваць найбольшы даход. Дык вось дзеля таго найлепш выгадовываць, абы толькі ўмеючы, сваё ўласнае насеньня.

Вядома кожнаму, што каб завясьці сваё насеньня, трэба пакінуць варыва на высадкі. Але якжэ гэта найчасьцей у нас робюць? На высадкі пакідаюць галоўкі капусты найгоршые, каторые ўжо не здатны да шаткаваньня: бручку, ці буракі таксама аткладаюць на высадкі найменшые і найгоршые.

— „Усё роўна, кажуць, і так зацьвіце, дык і насеньня будзе“.

Праўда: насеньня зьбярэцца і з дрэнных высадак, але варыва, каторае вырасьце з гэтаго насеньня, так сама будзе дрэннае, неўрадлівае. Хочучы-ж мець добрае варыва, трэба выбіраць на насеньне добрые высадкі.

Пачнем ад капусты. На высадкі трэба адабраць цьвёрдые, пекные галоўкі—словам такіе, якіе мы хочэм, каб былі ў нас к налецьцю. Калі німа у сваім гародзе пекных галовак капусты, то лепш купіць дзе на старане 2—3 штукі на высадкі і тады ўжо завядзём у сябе добры сорт насеньня капусты.

На зіму галоўкі капусты трэба хаваць ў склепе, засыпаючы ўвесь качан па галоўку пяском. Ліст зверху можна абарваць, бо ўсё роўна згніе. Калі-ж склепу німа, то можна хаваць ў халоднай каморцы, таксама закапываючы ў пясок, або нават у ямы, абы на высокім сухім мейсцы (так як бульбу), толькі падчас адлігі незабывацца аткрываць прадушыны.

На высадкі буракоў, бручкі, морквы і рэдзькі выбіраць трэба пекные, здаровые каліўя не малые, але і ня лішне вялікіе. Ліст абарваўшы, пакідаем толькі самую сярэдзіну, пры галоўцы, каб мелі аткуль пушчаць расткі на вясну. На зіму хаваць можна у такіх самых мейсцах, як і капусту, толькі ня трэба ў пясок садзіць, тыкеля класьці радочкамі, перасыпаючы пяском.

Калі будзеця так рабіць, то на другі год з гэтых высадак будзеця мець добрае, пэўнае насеньне і ня прыдзецца выкідаць на яго грошей.

Добра ешчэ мець у сваім гародзе—пад рукой і агуркі. Кажуць іншые, што ў вёсцы гэтаго не варта заводзіць, бо за дзяцьмі ня ўгледзіш і агурочка. Трэба дзяцей прывучаць каб шкоды нікому не рабілі, тады і агуркі можна сьмела садзіць.

На насеньне агуркі трэба пакідаць самые ранные, пекные; трымаць на градзе пакуль добра не пасьпеюць і не пачнуць трэскацца. Тады, выбраўшы з іх насеньня, перэпаласкаць на рэшаце, а пасля высушыць.

**Алена.**

# Як лечыць жывелы.

Калі жывёла здарова, то яна жывая маетнасць і правая рука гаспадара. Дзеля гэтаго кожны гаспадар павінен берагчы сваіх жывёл перэд хваробамі, а калі захварэюць, то ратаваць іх і старанна даглядаць.

Бадай усіх хвароб на жывёл можна былобы унікнуць, калі-б ведаць прычыны праз каторые яны шыруцца, а такжэ способы, як бараніцца ад іх у першых пачатках, пакуль не прыбудзе вэтэрынар і не скажэ як далей паступаць і што рабіць.

Важна рэч ведаць, што усе хваробы у жывёл раздзеляюцца на звычайные—як запаленьня, катары, скалечэньня ды іншые часовые—і заразные. Прычынай першых хвароб найчасцей бывае прастуда, перэпрацаваньне, благі пошыр і стайня, невыгодная упраж, неасцярожнасць, ды благое абходжэньне у дарозі і пры працы.

Другіе хваробы—заразные,—выклікаюць так званые—заразкі (гэтадробненькіе жывучкі—бактэрыі), каторые плодзюцца у брудзе, у брудных, задушных хлявох і ў нячыстай вадзе, а адтуль дастаюцца у пошыр, ці пераносюцца праз упраж, мух—у жывёлу і ў целі яе пачынаюць шпарка пладзіцца і гэтым выклікаюць не раз дужа цяжкіе хваробы, каторые пераносюцца на другіх жывёл, а нават і на людзей.

Кожная заразная хвароба можэ стацца пошэсцю (эпідеміей) калі жывёлы адна ад другой заражываюцца і хвароба захоплівае ўсю ваколіцу. Да такіх заразных хвароб, каторые могуць стацца пошэсцю належуць:

**I. Яшчур** (прышчаўка). Паяўляецпа зазвычай у кароў нехайна трыманых, рэдка у сьвіньней. Здаровая штука траціць раптам ахвоту да яды, сухой пашы, і, ня жве жвачку—стаіць асалавелая, а з морды пачынае цячы сьліна. Цеплата цела і воддыху раптам павялічываецца, а заглянуўшы у рот пабачым на верхніх дзёснах і на языку плоскіе пузыркі бытцым ад апарэньня.

Праз 1—2 дні пузыркі нарываюць, злучаюцца с сабой, павялічываюцца і лопаюцца, а з іх выплывае правідны бруд, падобны да белка с курыннаго яйца. Жывёла тады найболей гарачкуе, сьлініць, ды разносіць заразу. Часам замест пузыркоў аткрываюцца на верху раны з нарыўнымі берэгамі. Гэтые ранкі у 1—2 дні пакрываюцца брудным струпам і памалу, пачынаючы ад берагоў гоюцца. Хворая штука памалу пачынае ачунівацць, здаравець, знаходзіцца у яе ізноў ахвота да яды і за колькі дзён лячэньня саўсім здаравее, хоць ешчэ да 3 тыднёў можэ яна заразіць другую, сьвежую жывёлу гэтай хваробай.

Лечыць трэба так:

1) Хворую штуку трэба дзержаць у адным якім, сухім і спакойным мейсцы.

2) Даваць ей дужа мяккую пашу, каб сечкай ці чым цьвёрдым не параніць ей у губі і хваробу гэтым не прадоўжыць.

3) Посьле кожнай яды і апроч таго 3—4 разы у дзень, перэмываць ей у губі мяканькай рызіначкай, змочэнай у 3 проц. растворы к р э о л і н ы. Крэоліны можна купіць у аптэцы. Раствор крэоліны робіцца так, што на 100 чарак вады, даецца 3 чаркі крэоліны.

4) Шчэлкі паміж капытоў прамываць раз на дзень крэолінай разведзенай папалам з вадой. А ешчэ лепей—намачыць у гэткім растворы крэоліны доўгі і вузкі матуз, улажыць яго паміж на чыста вымытых капытоў, абвязаць чыстай анучай, ды раз у дзень зверху паліваць крэолінай. Гэта абараняе капыты ад прышчаўкі.

5) Калі апрышчуцца і разранюцца капыты, то хворую нагу трэба вымачыць у слабым лугу—засыпаць цёртым галуном, ці сінім камянем, а апасьля абандажаваць, як сказана у уступе 4.

6) Да хворай штукі не дапускаць сабак, курэй, гусей і інш. каб не разнасілі заразы

7) Ад хворай каровы малака ня есьці, бо яно шкодзіць на жывот, а дзеці ад яго заражываюцца прышчаўкай.

8) Перэхварэўшых штук не выпускаць зара на пашу (да іншых жывёл), бо яны, хоць бытцым здаровы, але ешчэ 2—3 тыдні маюць у сабе заразкі і могуць заражываць іншых.

**II. Карбункул** паяўляецца найчасцей у жару у асобных штук, найчасцей у маладых, добра кормленых, раздэлікачэных. Хвароба гэта бывае як у кароў, так і коней. Часам заразка вызынклікаючая гэту хваробу у неахайных стайнях, ніколі не дэзынфэкаваных (ня спрыскаваных карболькай, ня беленых вапнам) прадзержываецца цэлымі гадамі, забіваючы час ад часу сьвежа уведзеные штукі.

Даткнёная гэтай заразай штука, раптам, без ніякай прычыны крэпка гарачкуе, ня есць, ня пье, стаіць сумная і трасецца, кроў набегае да галавы, а вочы наліваюцца кроўю, аддыханьня скорае і не рэгулярнае—дужа часта ня мочыцца і не аддае калу—у канцы дастае нападу конвульсій і гіне у 1 дзень, ці 1 ноч.

У кароў па сьмерці запухае горла і ідзе з морды пена; у коней паказываецца чорная кроў з атходнай кішкі. Труп не калеіць ніколі і кроў чорная як дзёгаць у такой жывёлы ніколі не сцінаецца. Хвароба гэта дужа наглая і заразлівая, а заразкі множуцца толькі у крыві, дзеля гэтаго ніколі ня трэба пускаць, кроў, бо праз гэта шырыцца зараза.

Карбункул дужа небаспечная хвароба, бо пераносіцца і на людзей, а кожную жывёлу на сьмерць забівае і то праз 1—2 дні, аб лечэньню, пусканьню крыві і інш. німа што й думаць, бо гэта ўсё не памагае.

Таму пры гэтай хваробе найкарысьней аддзяліць хворую штуку ад здаровых і паклікаць вэтэрынара, каб абараніў рэшта

жывёл ад гэтай хваробы, ды хворую штуку папробаваў вылечыць; бо апошнімі часамі прыдумалі прышчэпку і гэтакая прышчэпка у пачатках дужа памагае.

**III. Сьвінны мор. (чума)** Хвароба доўгая—ад 1 тыдня да 2 месяцоў. Хворая сьвіньня хрыпава кашляе, ляксуе, на вачах худзее, ходзіць памалу, закідаючы задам (паражэньне крыжа), выгрэваецца на сонцы, або закапываецца у салому, бляднее ўся, мала есць, многа пьець.

Пры паморы на сьвіньней лекоў німа. А каб гэтая страшная пошэсць далей ня шырылася найлепей хворые штукі забіваць і закапываць, а у хлявох і панадворку зрабіць акуратную дызэнфэкцію, бо гэта зараза дужа трывалая і як загнездзіцца раз, то тады усе сьвежые штукі будуць на гэту пошэсць западаць і бядзе канца ня будзе.

**IV. Рожа у сьвіньней.** Паяўляецца у жару, развіваецца ад неахайнасці у сьвінярніках, найчасцей на маладых сьвіньнях 3—12 месяцоў. Азнакі хваробы тые самые, што і сьвіннога мору. Спэціяльные гэтай хваробы аб'явы: хворая сьвіньня дужа гарачкуе, траціць саўсім ахвоту да яды, пастаянна ляжыць—але не закапываецца, не худзее і на бляднее, а наадварот сінее на лычу, вушах і пад брухам—і праз 2—5 дзён гіне. Часам дужа неспакойна, бегае, квічыць, круціцца, пухнуць павекі і чырванеюць вочы. А калі паявіцца у яе круглая высыпка, як шэстак, на хрыбце, то папраўляецца; найчасцей-жэ гіне.

Рожу сьвіньней можна наперад прышчэпліваць і тады сьвіньні, або саўсім не хварэюць, або пераходзюць яе у лёгкай форме. Прышчэпкі можэ рабіць толькі скацінны доктар.

**V. Крупец.** Гэтай хваробы за жыцьця, а асабліва у пачатках пазнаць ня можна. Бо хрыпавы голас, ахвота да рыцьця і лянівые рухі тут ня дужа выразны. Часамі глыбока пад языком паяўляюцца малые, як зярно канаплі, вадзяністые крупкі, але не заўсёды. Толькі па сьмерці можна бачыць крупец акуратна у мясе. Выглядае такое мяса, якбы с крупкамі, асабліва у шчы і шынках.

Крупец вылечыць ня можна. Дастаецца ён у жывёлу, калі тая зьесць кал чэлавека хвораго на салітэр. Хворых на крупец сьвіньней трэба калоць і апрача саланіны і сала—усё мяса нішчыць. Есьці ня можна, бо шкодзіць і у людзей паўстае ад яго страшная хвароба—салітэр.

**VI. Насацізна—Сап.** Хворы сапам конь гарачкі не мае і рэдка калі кашляе—есць добра, а худзее і волас на ім калмаціцца. Пры тым з носу (найчасцей з левай дзіркі) выцекае сьмярдзючы, зеленкавата—крывавы сьлюз, а з гэтаго самаго боку, пад шчакой паяўляецца цьвёрды груз—велічынёй з галубовае яйцо, не гарачый, стручкаватый, і да шчакі і скуры прырошчый. Хвароба цягнецца месяцамі.

Усе гарачые, расплыўшыеся ды балючые пухліны горла з вадзяністымі або жоўтаватымі адплывамі з абодвых дзірак но-

су, ды пры тым гарачка; нехват ахвоты да яды і кашэль—гэта не сап, а звычайные золзы, каторые трэба толькі не засутджываць.

Сап хвароба дужа заразьлівая і яе вылечыць няможна, дзеля гэтаго калі вэтэрынар агледзіць і скажэ што сап, то найлепей такога каня забіць і цэлікам закапаць, а мейсцо па ім і упраж акуратна выдэзынфокаваць. Гэта зараза дужа лёгка параносіцца і на людзей.

VII. **Пархі у коней.** Хвароба наскурная—выклікаюць яе дробные заразкі, падобные да гнід. Выяўляецца стрыжэнемся валос паміж вушэй (пад начолкам)—ўздоўж карку, пад грывай і на перэдзі грудзей—а іншы раз на задніх нагах і хрыбце. Валосься выпадае—конь чхае і аціраецца дужа часта.—У мейсцох заражэных паяўляюцца дробненькіе, як галоўка шпількі, сухіе гузочкі—пасьля мейсцы занятые лысеюць, а скура грубее і фалдуецца. Хвароба трывае гадамі.

Зараза гэта пераносіцца с каня хвораго на здароваго праз аперанньнеся, праз упраж, жолаб, гуньку, а прыстае толькі да коней нікольки ня чышчэных. Хворую штуку трэба найпарш адасобніць, вымыць акуратна крэпкім лугам і мылам—асушыць, а пасьля намазаць лекарствам ось такім:

| | | |
|---|---|---|
| Дзёгцю | 50 | грамоў. |
| Крэоліны | 50 | „ |
| Шэраго мыла | 10 | „ |
| Цёртай крэйды | 30 | „ |
| Віннаго спірту | 150 | „ |

Гэта усё разам змешаць—трошкі нагрэць і вымытаго каня добра нацерці, а пасьля накрыць яго гунькай і трымаць у хлеві 3—4 дні. Пасьля ізноў вымыць, высушыць і ізноў нацерці лекарствам. Зазвычай па 2 разох ужо конь вылечэны, азнакай чаго бывае, што валасы адрастаюць, а конь выгладжываецца. Калі-б ешчэ асталіся дзе струпочкі, то трэба ешчэ раз нацерці. Пасьля трэба усю упраж, жолаб, драбіну і стайню акуратна абмыць карболям.

VIII. **Сухоты** Найчасцей бываюць у кароў і авец. Хворая скаціна кашляе, худзее. Сухотные каровы ня целюцца, мала даюць малака, каторае сырое можэ заразіць і чэлавека сухотамі. Найлепей такую карову прадаць на бойню.

IX. **Не заразные хваробы,** вымагаюць найперш за ўсё дагляду.

**Раны, ссадзіны, уколы** лечуцца так: сперша ачысціць рану ад гразі. (Найлепей абмываць цёплай вадой с карболькай), а пасьля акуратна чыстай рызіначнай абвязаць. Калі крэпка ідзе кроў то рану трэба замазаць такой вось мазьзю:

1 лыжку таніны.
1 „ галуну.

1 „ борнаго квасу.
1 „ нафталіны.

размешаць са шклянкай алею.

**Вочы**, калі яны заносюцца брудам налепей прамываць цынкавай вадой, ці борным квасам (малую лыжачку борнаго квасу на шклянку вады).

**Макрэц.** Паяўляецца у кароў і коней ад макраты у хлявох. Пад шчоткай, каля капыта паяўляецца невялічкая пухліна, чырвонка і белые пузыркі, каторые лопаюцца і з іх выцекае жоўтаватая цеча. Калі гэту хваробу запусьціць, то яна робіцца вечнай. Трэба даць сухую падсцілку, ногі абмыць крэолінай і абвязаць. У упорных прыпадках ужываць такую мазь: 1 часць ляпісу і 20 часцей парафінавай мазі.

**Вошы і кароста у целят.** Мыць крэпкім лугам з зялёным мылам.

**Уздуцьце жывата.** Бывае у кароў ад благога пошыру, сочнай і ядавітай травы. Жывёла стаіць раскярэчыўшыся, задыхаецца, жывот—калі ударыць—зьвініць, асабліва з леваго боку. Лекарства: даць тры бутэлькі алею с таўчоным вугалём, а калі не памагае, то трэба пракалоць трыбух нажом у левай пахвіне. Нож трэба настаўляць наўскось пахінаючы чэранок к заду і крыху да зямлі. Сьмярдзючы газ са сьвістам вылетае і карова выздараўлівае.

**Запаленьня вымя.** Найперш трэба вымя чыста абмыць, высушыць і намазаць камфорай з гліцэрынай, або аднэй камфорнай мазьзю і як можна часцей здаіваць. Гэта-ж самае рабіць пры гузах у сіськах і вымі.

**Радзільная гарачка** у кароў бывае пасьля ацёлу. Карова не ўстае як бытцым у яе адняло зад, ня есць ня пьець, гарачкуе. Лячэньне дужа простае: узяць касцяную трубачку і ўдуць у кожную сіську паветра (лепей спрыцоўкай), як можна болей. Пасля дво-трох ўдуваньнёў карова папраўляецца.

**Млькі** у коней бываюць ад благога корму, перагону зара пасьля яды, абпою пасьля аўса. Конь неспакойна перэступае нагамі, аглядаецца, круціць хвастом, кладзецца, качаецца. У такіх прыпадках трэба даць у сярэдзіну каню 2—3 бутэлькі алею, калі ёсць гляўбэрская соль, то два фунты яе можна даць. Бакі і бруха трэба як можна крапчэй расціраць тэрпатынай, або проста саломай. Не даваць каню качацца і ўвесь час вадзіць. Калі конь зляксуе і супакоіцца, то накрыць і не даваць есьці цэлые суткі, бо хвароба можэ вярнуцца. Піць даваць у волю, асабліва пойла.

**Ахват** бывае ад прастуды калі мокраго каня, паставюць на падвей, ды ад піцьця калі напоюць каня сагрэтаго. Найперш трэба даць каню у сярэдзіну 2—3 бутэлькі алею, капыты абвінуць мокрымі сцюдзёнымі анучамі, аблажыць сьнегам, прывязаць мя-

-шок з лёдам. Ногі церці саломай як найкрапчэй. Даваць два разы у дзень па 1/6 часці фунта саліцылівага натру.

Гніцьцё стрэлкі лечыцца так: ачышчаюць стрэлку да жывога мяса і абвязаўшы чыстым, паліваць што дзень растворам сіняго каменя (кавалак с курыннае яйцо сіняго каменя на бутэльку вады).

Расшчэпы капытоў, каторые ідуць з нізу, трэба канцом на жа перэгарадзіць ім дарогу у верх, вырэзаўшы пяпярэчны жалобак. Суцэльную трэшчыну збіваюць цьвекамі.

# З роднай нівы.

---

## Горсць пшаніцы.

(*С Кондратовіча*).

Піліп стары у грамадзі
Старшыною быў с паўвека.
Ці у працы, ці у радзі
Німаш як ён чэлавека.
Шчыры, добры і разумны,
Гаспадар прытом на дзіва,
Вёў найлепей сход наш шумны,
Судзіў, радзіў справядліва.
На ўсю воласць гаспадары
Гутарылі так часамі:
«Дай Бог, каб наш доўга стары
«Старшыною быў над намі!»
Толькі Піліп ўсё матае
Сваей сівай галавою:
«Не змагу я, Бог то знае,
«Быць вам, дзеткі, старшыною.
«Летак многа мне на карку,
«Сталі сілы як дзіцяці,
«Цяжка весьці гаспадарку
«І грамадзкі справы знаці.
«Прышла старасць, горб на плечы
«Ад вялікай сеў натугі;
«Пара, дзеткі, легч на печы,
«Самі сабе радзьца, другі!»

Пашоў гоман на ўсём людзе
І ня вымысьлім нічога,
Як яно уперэд будзе
Без Піліпа, без старога?...
Крыкі, сваркі былі многі.
От—пришлі мы вёскай ўсею,
Пакланіліс яму ў ногі,
Ды і кажэм: «Дабрадзею!
«Не кідай нас сіратамі!
«Які пень, така галіна:
«Як ня можэш правіць намі,
«То, будзь ласкаў, дай нам сына!»
—«А каторага?»—«Не знаем;
«Ты сам дзетак пазнаў болі!
«Каго, старым абычаем,
«Па сваей нам радзіш волі?»
— «За чэсьць, дзякуй, гаспадары,
«І за ласку, і за веру!..
«Сыны мае—не нездары,
«Знаюць праўду, знаюць меру.
«Але, Богам і сумленем,
«Хто-ж іх знае, што за людзі.
«Мы над новым пакаленем,
«Шчыра *кажучы,—ня судзі.*

«Трудна сказаць дзеткам, ўнуку:
«Выбірай дарогу гэту!..
«От, сыноў я на науку
«Усіх трох пушу па свету:
«Ніхай свет пабачуць ясны,
«Што там права, што там крыва,
«Каб свой кут радзімы, ўласны
«Распазналі справядліва.
«А як звернуцца у хату,
«Мы пабачым тэй парою,
«Быць каторaму з іх брату
«Над грамадай старшыною.»
—«Добра!» кажэм. Пашлі скора
Андрэй з Янкам на віціну,
А найменшаго Грыгора
Паслаў Піліп на Украіну.
От Андрэй прышоў у хату
Не пазналі, так адзеты.
—«Кепска у нас ходзюць, тату!
«Злы мужыцкі звычай гэты:
«Усе чорны, усе брыдкі,
«Закарэлі ад работы!
«Лепей кінем нашы світкі,
«Нашы лапці, нашы боты,
«І, як немцы з за граніцы,
«Возьмем курткі пекны, сіні!
«Дзеўкі! хусткі і спадніцы
«Я для вас прывёз у скрыні!»
Стары Піліп у куточку
Адно круціць галавою.
—«Брэшеш, кажэ, ты сыночку,
«Ня быць табе старшыною!»
Прышоў дамоў срэдні, Янка.
Папаў як раз на вяселля:
У суседа іх гулянка,
Вялік гоман і пахмелле;
Стары, малы—ўсе у тане,
Аж дрыжыць старая хатка.
—«Ты чаму не скачэш, Яне?»
—«Брыдка у нас скачуць, татка!
«Каліб толькі захацелі,
«Научыў бы, добра знаю,
«Скакаць вальцы і кадрылі,
«Як у тым танцуюць краю.»
Пашоў Піліп у куточэк,
Сеў і круціць галавой.
—«Брэшэш, кажэ, ты сыночэк,
«Ня быць табе старшыной!»
Прышоў Грыгор. Абнімае
Бацьку, матку, сёстры, брата,
С кім нацешыцца не знае,
Гдзе прыткнуцца серед хаты.
—«Пекна, кажэ, Украіна;
«Там цяплее свеціць сонцэ.
«Як кінь вокам—усё раўніна,
«Стэп на ўсей залёг старонцы.
«Добра там, а толькі—нуды
«Па радной зямліцы нашай.
«Нашу вёску сніў я ўсюды
«З ляском, з рэчкай, с полем, с пашай!
«Адно, што—там завістна — глеба!
«Як той вугаль усюды чорна!
«Божэ мілы, што там хлеба!
«Ураджай які там спорны!
«Сівы волы шесцярнёй
«Аручы, валочуць плугі,
«Ну, і родзіцы!—Там парой
«Усе калосься, якбы пугі.
«Я прывёз, дасць Бог, не дарам,
«Цэлы мех аттуль пшаніцы;
«Дам па горсці гаспадарам,
«Можэ з нашай Бог зямліцы
«Нас надзеліць ураджаем,
«Як на гэнай Украіне!?»
Піліп сказаў: «Цяпер знаем:
«Старшыюю будзеш, сыне!
«З дурня—глупая навіна,
«Шчырай праўды ані знаку.
«Каму світка славяніна
«Не прыходзіцца да смаку,
«Хто наш звычай, ці ігрышчэ
«На пасьмешышчэ падыме,
«Што-ж з яго край родны вышчэ?!
«Што-ж с пустой каліты выне?
«А хто сэрцэм, душой рады,
«Да сваіх прыльнуцца скоры,
«Той нам брат! Будзь над грамадай
«Старшыною ты, Грыгоры!»

*Янка Лучына*

# Міхаська.

Міхась вельмі не ахвотна на гэты сьвет прыходзіў. Тры дні радзіўся. Людзі рукамі махнулі: „нічога ня будзе ні з мацеры, ні з дзіцяці“, казалі. Толькі на чацьвёрты дзень: «угай, угай», загаласіў на ўсю хату народжаны хлопчык.

Матка глянула: Божэ, якіж брыдкі! хаця-б шчасьлівы быў... зашэптала бедная кабета, хацела пацалаваць цзіця, аткрыла вусны, але не стала сілы... заціхла.. Заціхла так, як песьня часам ціхне на найжаласьнейшым сваім слові...

У хлопчыка насок з добрую бульбачку; барада—брылём закручэна праз усенек левы тварычак чырвоная пляма радзіма. Адно вочка глядзіць у правы бок, другое—ў левы... „У Імя Айца і Сына“ ось гдзе Божа кара!!“... ледзь здоляла прабалтаць бабуля, купаючы першы раз дзіця.

Міхася—сірату запіхнулі ў запечак; так ён там і рос, не мяркуючы, як тое дзікае зельечка пад абваліўшымся тынком.

Адзін раз зімой парасяты, гуляючы, адкінулі качаргу, памялу і розны іншы гаспадынін рыштунак. Запечак разявіў чорны рот, а у ём, як белы зуб, паказалася сьветларусая галоўка Міхася. Сонейка на тую пару, праз вакно улезшы, блудзіло па хаці і, убачыўшы Міхася, падумало: бедны хлопчык! Улезло на прыпечак, ды давай забаўляцца з Міхасём: лып, лып! па галоўцы дзіцяці колькімі праменямі. Хлопчык у кудлачках аж паскрабецца з дзіву. А слонка лып, лып! дрочыцца далей. Міхась пачаў лавіць—сонейка за косы, а тое с прыпечку—гоц, ды за дзьверы Міхалюк ў аднэй сарочцы ў дагонку на падворак: пазаплоткамі ляціць, цешыцца, сьмяецца. Ажно скуль ня вырвецца Воспа і ідзе, брыдзе пад нос мармочэ; спаткаўшы Міхася, аж заіржала з радасьці, паганка. „А мой ка сякі, а мой ты такі“... кінулася да Міхася цалаваць, абымаць... „Адхініся, лупатая!“... чуць ня ўдэрыў яе Міхась, дый лататы ў хату.

Калі распаліць пасьля хлопца; мурашкі па скуры гіжаць і у падошвы смаліць.

„Гвалт“—крычыць мачыха, гэтаж у Міхася воспа, ён і мае дзеткі заразіць“. Што тут рабіць? Параіліся, ды йшчэ глыбей Міхася у запечак засунулі.

Сколькі хварэў Міхась, хіба сам час знае, ды тые прусакі, што с хлопчыкам разам грэліся ў запечку. Толькі пасьля воспы, як паказаўся Міхась на хаці, дык ажно куры закудакталі с перапуду. Певень хоць куды сьмялейшы, аднак стуліў і ён у трубку хвост. „Р-а-б-ы, Р-а б-ю-ю-т-а-н-ь-к-і!“ закукарекаў і схаваўся ў падпечак, хітры. Выдзярыкуст адразу як мабыць пазнаўся на пекнасьці хлопца, бо аб Міхася твар, хоць хрэн дзяры. Столькі вываратняў на ём воспа накачала.

Пачаў Міхась у поле скаціну ганяць. Чураўся ўсіх, хадзіў насупіўшыся ня верыў нікому. Як хто на яго глянуў, зараз Міхасю здавалося, што той аб ём думае „у-у які рабы, страшны хлопец". На тую пару якраз пасыпаліся прозвішчы ад пастухоў: „Рабы, Галдабыр, Касьня"... куды—на валовай скуры тых прозьвішчаў усіх ня спішыш. Міхась маўчаў, зубы сьцяўшы, а ў патайне ўсіх ненавідзіў. Кожнаму мсьціў колькі мог: гдзе каторага пастуха птушку асочану з гнезда выпарэ, то торбачку с хлебам у балота закіне і чужую скаціну у шкоду нажане. Жывіна так сама не зазнала ад Міхася ласкі: бізуном рэзаў кожну скуру; Мацеяваму бычку рог скруціў; падцёлцы Канцавога Лукаша зьбіў клуб. Нат сорамна расказываць, такіе ліхаты выкідваў.

„Па што ты майму Рэбчыку хвост адарваў, касавокі ты асмолак, гад!.. сварыцца, на чым сьвет стаіць, старая Алена. А Міхась—не, не—ды новую закалубіну прыдумае. А як ужо німа да чаго прычапіцца, то хоць мухі ловіць і скрыдлы абрывае. „Вірутны чорт", думалі аб Міхасю людзі. Пастухі збрыдзілі, не падпускалі хлопца да сябе, як вужаку і Міхась асобна пасьвіў сваю скаціну. Праўду сказаць і сыпалі хлопцу не раз да жывога, але Міхась неяксьці заціснуўся ў сабе, што ні пісьне, ні ёйкне, хоць ты яго засячы да сьмерці. „Божухна, што гэта за дзіця! проста апускаюцца рукі, ахвота прападае біць", скаржуцца тые людзі, каму Міхась шкоду, зробіць.

Ні ў казцы сказаць, ні пяром апісаць, такая пэўна выраслаб з Міхася цацка, каб не адно здарэньне.

Была ўжо позная восень; сцюдзена, туманна і дробны дожджык сыпаў імглой і пачарнелае поле і луг лежалі ў некім моташна—мёртвым сьне...

Пастухе разлажылі агонь. Вялікае вогнішчэ рагатало і пеклася бульба. Яська, па прозвішчу Даўгавязы, дуў з усей сілы у трубу: „Тру-тру-ў-ў-ў... ішло рэхам па апусьцелым полі, ды шчэ сумнейшай ставала восень. Міхась сядзеў адзінока пры мокрай дарозі, водаль ад пастухоў. Галоўка яму нешта балела, пылалі шчочкі. Скуліўся у клубок, бытцым тая шэрая купінка, наточэна кротам. Думкі яго былі невясёлые, поўные сьлёз, бы тые восенскіе хмаркі, ня выплаканые дажджом. Часам нават скаржыўся праўда, казаў, няго дны я хлопец, усім прыдумываю ліха, але, хто для мяне добры? Усе як на ліхога сабаку: „а ту... а та-та"!...

Горкіе словы каціліся з дзіцячых губак, як цяжкіе каменьні: на мужыцкую ніву. Бычок чорны нідалёка хадзіў. Міхась, натрапіўшы косымі вочкамі на бычка, яшчэ горэй даўся ў жаль. „Такі чорны гад як гэты бычок, і той мяне ня слухае!.. Нябось, іншых пастухоў баіцца: толькі крыкнуць, зара адверне рыла ад шкоды, а мяне.. каб с це скуру!!" Ня вытрываў хлапец, схапіўся і з усяго маху сьцебануў па хрыбяціне чорнаго бычка. Бычок падскочыў, адбег, аглянуўся: „павесься"! здавалося закляў ён сваім бычачым розумам і пашоў да стада. „А-а-а! паскаржся" крыкнуў у дагонку бычку Міхась і раптам заплакаў: Агэ, гэ, гэ...

Ня вытрывало дзіцячэ сэрцо ў маркотны восенскі дзень, каб не пажаліцца нац сваёй сірочай доляй. Міхасю стало завідна, што нават бычок і той мае для сябе прыхільнае стада...

„Дзяржы! бяры!.. Янук! Ігнат!.. лаві, а та-та!.. загрухацелі цэлай грамадай хлопцы. Беглі, гналіся упапярок загонаў за падстрэленым жоравам. Птушка ляцела, падала, уздымалася, бегла, з леваго скрыльля капала кроў. Нага была перабіта. Хлопцы немала што ўжо хваталі за перье акалечэну птушку, але яна недавалася, уцекала, выбіваючыся з апошніх сіл. Угледзіўшы Міхася, мо падумала што куст, або што іншае.. згадаеш птушку.

Але, толькі даляцеўшы да хлопца, ўдэрылася ўсім целам у яго грудзі „Крр—крр“... жаласна запішчэла. Міхасю здалося бытцым птушка просіць: „ратуй... ратуй“...

Шасць—Міхась абхінуў жорава поламі рванай сьвіткі і растапырыў рукі—„Аддавай, рабы“! закрычэлі хлопцы—„Ні дам!“— „Аддавай!“—„Ні дам“,—„Аддавай, закрычэлі пастухе, абступіўшы цесным кругам, турзалі Міхасём, як высахшай галінай.

— Адыйдзіця, ёй, ня турзайце, застагнаў Міхась, пад сэрцам цісьне... Пусьціця! Хлопец хапіўся за грудзі.. ёй... ёй... штож гэта... нне... не пасьпеў дагаварыць, зьбялеў, як палатно, і асунуўся ў разору. Пастухе перэпалохаліся. „Вады!“ скамандаваў найстаршы!.. Міхась, Міхаська, братка, мы табе жорава аддамо“, пачалі угаварываць, падымаць, калыхаць. Хлопец, лежаў, бы надломаная саломінка. Задыханы прыляцеў Янук с поўнай шапкай вады. Адчынілі складанчыкам зубы, ўлілі колькі капель вады.—„Міхась братка, ці чуеш?“ Цераз поўмінуты Міхась уздыхнуў, губы пачалі чырванець. „Перэнясём“, азваўся каторысь с хлопцоў. Асьцярожна ўзялі пастухе Міхася на рукі і перэнясьлі да вогнішча. Міхась, як аткрыў вочы, бачыць вогнішчэ пылае, пастухе каля яго кратаюцца, кажушок пад галаву падлажылі, гальля ў вагонь падкідаюць, каб цяплей было; жораву скрыдлы падвязываюць, хлеб крышуць; „на—кажуць птушцы—еш, пасьля Міхась цябе накорміць ячмянём“. Міхася сірочае сэрцэ ўлёт дабрату хлопцаў зразумело. Хочэ да іх загаварыць, падзякаваць, але галоўка цяжкая, вені ліпнуць, а нешта у нутры шэпчэ: пасьля, пасьля...

Ледзь пастухе адвялі Міхася да хаты. Жорава забраў с сабой.—„А гэта што?“ накінулася мачыха, хапіла жорава за скрыльля і выкінула у сенцы. „Ты зноў хворы? Думаеш буду с табой цацкацца, дармаедзе?!“

Міхась прысланіўся ў качарэжніку, стаіць, бы асінавы пеньчык. „Спаць, спаць“... ласяцца думкі. „А гыля... а гыля“ выляцела мачыха гусей адагнаць ад карыта.

Міхась, азірнуўся сонна, зачэрпнуў жменяю гароху з апалушак, падняў жорава і палез у запечак.

Цёмная чэлюсьць скрыла дзьве бязсільные крыўды. .

Пастухе ураіліся Міхасёву скаціну пасьвіць. Часам каторы с хлапцоў забегаў на птушку падзівіцца.

Птушка хутчэй папраўлялася ад Міхася; але сядзелі разам

у запечку, не раз страшэнна галодные, бо мачыха абодвых нянавідзіла. Як выходзіў жораў, то зараз гналася с пожахам за ім.— „Бедны, клыбачка, галодны, „літуецца Міхась над жоравам.—„Кр“, як бы адказуе птушка.—„Нудна табе, сірата ты мой: радня выляцела далёка, пакінула цябе аднаго. Не плач! бо і я таксама адзін, як той калочак у плоці; матулька ў пясочку ляжыць, ня прыдзе сынка хворэнькаго адведаць... Як выздаравееш—узьнімемся на скрыльля і паляцімо далёка, далёка... аж пад сонейка яснае... Праўда, клыбачка?—„Крр“—„Эх, ты, жораўка, братка ты мой родненькі“, цалуе па перьях хворы Міхась птушку.

Жораў Міхася слухае, аднак свой розум мае. Хутка прыглядзіўся і зжыўся с хатнім парадкам. Гаспадыні пад ногі ня лезе. Парасят, як лішне прыстаюць да малога дзіцяці, так іх зараз дзюбай карае. Над курмі стаў праўдзівым ваеводай: да парадку прыводзіць і ні адна не адважыцца узьляцець на лаву.—„Каб ты здохла, якая ты разумная, птушка“, падчас ўдабрухаецца мачыха і падсучэ жораву сьвінога цеста.

Ужо былі добрые прымаразкі, як Міхась пачаў выхадзіць на хату. Бляды як сьняжыначка, нічога не баліць, толькі часам закашляе. Зрабіўся паслухняны, спакойны, задуманы. Бульбу мачысе скрабе і дзіця, гадуе, хату падметае. А жораў—бытцам хвост хлопцаў: ззаду ходзіць—не адстае.

Аднэй лыжкай, ядуць, разам сьпяць. Міхась, здаецца, сваю сарочку ўздзеў бы на жорава, каб гэта выпадала.

„Жораўка, пацалуй“ Міхась падстаўляе шчокі. Птушка грымзае дзюбай па твары, а сіраце здаецца, што яго і запраўды цалуе. Цешыцца—не нацешыцца хлопец. „Пачэкай, клыбачка, прыдзе весна, пажанём кароўкі ў поле і скруцім дудку, будзем іграць!! Жупяць, не нажупяцца сабе два хваравекі.

Час ім хутка ідзе, быццым вада плыве. Вечэрам бывае, што прыдуць вясковые хлопцы палядзець па жорава, казкі часам расказываюць...

Міхась пад вясну неяксьць стае лянівейшым: усё яму хочэцца больш палежаць; с хлопцамі атпала ахвота кумпанства вадзіць. Работа, празначэная мачыхай, часта ляжыць не пачынаной, а за гэта мачыха часьцей куксае хлопца. Міхась з жоравам вытварылі сабе нейкае асобнае жыцьцё; бяз слоў разумеюць адзін другога; с сабой не разстаюцца.

Хутка праляцела зіма; павеяў цяплейшы вецер; пачаў сьнег сходзіць і мухі забарабанілі на вокнах. Але Міхась ужо не прывітаў вясны, ня выбег на вуліцу. Лежаў, як пічэпачка сухенькі, таяў як васковая сьвечачка. Усе ведалі, што Міхасёвы дні ужо палічэны.

Мачысі сэрцэ падказывало: „Хутчэй бы дайшоў“... Жораў не хадзіў, як калісь па хаці, але стаяў у кутку, скрыльля апусьціўшы, і думаў нейкую людзям незгаданую птушыную думу. Ні было каму птушку накарміць, не было каму с птушкай пажупіць.

У чэцьверг раніцай сонейка цэлай галавой укацілося да хаты.

Куры кудкудакталі з вялікай курынай радасьці. Кот, Мацей, саскочыўшы с печы, пачаў мыцца. Гудзелі на шыбах мухі.

Паршучок рабенькі разваліўшыся ля парогу: „рох...—рох—рох" славіў сьвінскім абычаем прышоўшую вясну. Мачыха набільніцамі—та—та, та—та—стукала, ажно рэха на вуліцы ёй адгуківало—ткала шарак.

„Мама"... азваўся зьмененым голасам Міхась. У мачыхі сьціснулося горла ад страху. „Смерць"—віхрам праляцело ў галаве кабеты, бо Міхась ніколі яе не зваў мамай: неяксьць бяз гэтаго абыходзіўся у гутарцы.

„Мама... мамачка!" клікаў прысьпешэным голасам.—„Зараз бягу, Міхаська, чаго хочэш?" „Дай мне жорава",—„Міхаська, а мо хочэш малачка?"... „Не, нічога не хачу, дай мне толькі жорава". Мачыха паднесла жорава, паставіла на пасьцелі, а сама бягом на вёску склікаць баб.

Пакуль зышліся кабеты, Міхась ужо лежаў мёртвы. Жораў лапатаў скрыдламі, тоўкся с кута ў кут... „крр-крр" жаласна пішчэў, куры кудакталі.., „куд-куда, куд-куда," „а-у-у-ў"—ня вытраваў пад сталом Лыска і жаласна завыў і толькі падсьвінак рабенькі лежаў ля парогу і радасна „рох-рох"—хваліў сьвінскім абычаям вясну.

На хаўтуры сабраўся народ Нават старая Алена, у каторай калісь Міхась Рэбчыку хвост адкруціў, стаяла пры мачысі, ды адчытывала аванэлю па нябошчыку—Міхасю.

— „Бедная ты, суседачка, отож табе смутак, гэтакі хлапец удалы быў! Гэтаж жарты? каб ён, каму грушачку зглуміў, або агурочак вырваў"...

Жораў, забіўшыся ў качарэжнік, прыплюснуў вочы. Хто яго знае, ці ён спаў, ці яму было брыдка слухаць Аленіных слоў.. а мо хацеў сабе запамятаваць ноту хаўтурнай песьні.

„Вечны пакой яго душачцы!!" Загула ўся хата. Прыкрылстанам дамавіну і пачалі выносіць на могільцы. Жораў заварухаўся, азірнуўся па ўсіх кутах і вышоў за дамавінай. Людзі дзівам задзівіліся і далі дарогу птушцы. Сумна, важна, як сплакаі.ная маці, жораў першы пашоў за Міхасём.

„А-у-у-у", завылі бабы ад птушынай мудрасьці. Пастухе цеснай грамадкай дзержаліся ўсю дарогу па блізасьці жорава.

Прышлі на магілкі і апусьцілі дамавіну з Міхасём у выкапаны дол. Пачалі засыпаць.

„В-е ечны п-а-акой"... застагнала песьня... над сьвежай магілай; жораў задрыжэў, колькі разоў пахіснуўся на нагах і лоп—лоп... узмахнуў шэрымі скрыдламі і узняўся да лёту.

Паволі, цяжка птушка падымалася ў воблакі, бо несла с сабою вялікі жаль зоркам ясным, хмаркам белым... „Крр—крр", скаржылася гарачаму сонейку; „крр—крр", расказывала напатканым брацейкам жоравам.

. . . . . . . . . . . . . .

Цяпер могілкі ужо парасьлі дзірванам і там зялёна кругом. Як вокам сьцяць—густы лес шуміць. На магілцы Міхася крынічка стаіць і зьвецца яна „Жураўліные Сьлёзы“.

Восенны вецер гудзе, казку сумну нясе.

Жоўты ліст сьцеліцца на зямлёю, і ціха, ціха на задушкі ў цёмную ночку шепчэцца с крынічкай вадою. Я падслухала гоман сказ, як калісь жыў Міхась у запечку нашых хат, беларус малы брат.

**Цётка.**

# Сьведка.

У нядзелю ранюсенька заходзіць да мяне Панасюк. Тое ды сёе, а потым кажэ: „у тую суботу каб быў ты ў воласьці у сьведкі на суд“.—Як ў сьведкі, дык ў сведкі. Хоць я нічым нічога, казаў той, ніколі нікому.

Прыходжу — сідзяць. Я зірк — аж і ён тут, наш Бартак храмы.

Пытаюць суддзі: „а ты што знаеш аб гэтым дзелі?“

— Чаму, кажу я, не знаю? Ведама ўсё, казаў той, знаю.

— „Ну дык кажы“.

— Як казаць, кажу, дык скажу ўсё. Так і так, кажу, у мяне, кажу, Каруська (гэта жонка мая) надта, гадзіна рана ўстае. Так якасць пасьля Петра, якраз пасьля нядзелі, чуць зорачка занялася, яшчэ нават і дзеркач на балоці ні разу ня дзёрнуў, калі яна прыходзіць да мяне і будзіць: „Юзук, Юзук!“

— „Ці ты, кажу, здурнела, ці што якое? гэта-ж, кажу, нядзеля. „Гэта, яна кажэ, ўчора была нядзеля“.

— Я схамянуўся: праўда, ўчора. Як так, дык так.

— „Ідзі-ж, ты, кажэ, касіць на Лабок“.

— А той Лабок, каб ваша ведалі, дык чысты лабок. Як пойдзеш касіць, дык сцімбіркі толькі дзылінкаюць каля касы, ды казельчыкі скачуць, а сена гэтулькі, сколькі валасоў, вун, на галаве у пана суддзі (аддзін лысы быў)“.

— „Ну, ну—той кажэ—да дзела гавары. Ці відзіў?“

— „Відзіў, кажу, чаму ня відзіць? Святлюсенька стала, покі расчухаўся. Вот расчухаўся, пашоў пад свіран—узяць бы касу, а касы німаш; сюды—німаш, туды—німаш! Ніяк ня спомню, дзеў. Аж я гэта як рэзаў барана ешчэ з восені, ды уткнуў у сцяну, дык яе там ці іржа пабіла, ці мышы вышчэрбілі. Давай я яе клепаць,—а яна давай крышыцца. Клепаў—клепаў, клепаў, клепаў... Віджу нічога ня будзе, пара палуднаваць. Папалуднаваў, праўда, Каруська кіслага малака дала крышку, а у нас певрадойка ў гэты год была—казалі—палявала, а цяліцца не цялі-

лася. Пад'еўшы трошкі думаю: пабягу да Барткі храмога,—вот і ён тут, ні дасць салгаць,—пазычу касу.—Покі тое ды сёе, туды ды сюды, калі і сонейка стала хавацца. Прыляцеў да Барткі храмога (а ён сусед), калі яго німа. Косіць, кажуць, тыкі ж на Лабку (і у яго такіе-ж сцімбіркі); калі я слова сказаць, і Бартак тыц у хату,—і зараз пацямнела. Мы сабе аб тым, ды аб сім, а пасьля таго я пашоў да хаты вячэраць. Як цяпер помню еў зацірку з малаком. Дык чаму-ж я ня ведаю? Усё ведаю!—

—„А відзіў ты (пытаюць суддзі), як Пятрок Сушка Бартку біў?“—

— „Калі?“—пытаю.

— „Ды тагды, як тое было?“

— „Ня ведаю,“ кажу.

— „Які-ж ты сьведка?“

— „Але, кажу, якіж я сьведка?

І пашоў да хаты. А, праўда! па дарозі зайшоў да Бэрчыхі. А больш, дальбо, нічога ня ведаю!

**Мацей Бурачок.**

# Палясоушчык.

Трэці год ужо быў лясьніком на графскай пушчы, хадзіў цягам па лесі, па оступах, і ведаю што мядзьведзь ёсьць то ёсьць, але Бог бараніў спаткацца аж да гэтаго году; ды і цяпер ня ведаю, ці відзіў я мядзьведзя, ці ня відзіў. А вот як было: якраз у задушны дзень. Той дзень на ляпарт мы ўсе сабраліся. Прышлі рана, меўся лоўчы паляваць, ды штосьці з жонкай пабіліся, ці што, от так, яму было не да палявання, і пратрымаў нас да вечэра, без нічым нічога, а пад вечэр загадаў дроў нарубаць, так да ночы звялося.

Ноч цёмная мне да хаты трэба ісьці праз маю пушчу, праз оступ, дарогі ніякай німа, ідзеш логам, пасьла градой, а пасьля ізноў оступ, праз ручаёк доўгая старая ёлка можэ гадоў сто ляжыць вываратня і па ёй пераходзім бывала.

Якраз даходзючы да тэй вываратні думаю сабе: «вот Божэ барані цяпер мядзьведзь на спатканне»...

Аж шапка паднялася, аж сэрцэ ёкае, улез на вываратню, пугач негдзе стогне ў старым дубе, ешчэ страшней стала...

Калі чую: вываратня аж калышыцца, хтосьці ідзе з другога канца на спатканьня... Так і ёсьць, ён, мядзьведзь, сапець аж страх... А дождждык як з рэшэта сыпіць. А ведаю я што мядзьведзь палахлівы, але-ж і я ні надта каб ад яго сьмялейшы. Дай, думаю, спалохаю, я яго. Як зараву я па мядзьведжаму—уга! А ён шабалдыхць у балота, а крыкнуў, як чэлавек: «Ах»! Лячу бардзей да хаты ці не задраў ён маей каровы? Не, цэла, дзякаваць

Богу, ходзіць па гародчыку. Я ў хату шусьць. „Жонкэ, кажу, мядзьведзь за малым не задраў твайго Юзюка!“ Калі жонкі і ў хаці німа, дзеці сьпяць, сучка ляжыць пад сталом, смалякі гарацць на прыпечку і бульба прэе.

Што за прычына?! Я туды, я сюды—німа жонкі: ці не павесілася, думаю, са злосьці, што мяне німа, а яна тыкі дужа злая Калі пачэкаўшы трохі і яна ідзецць у хату—ўся мокрая, а дрыжыць як лісток.

„Жонка, кажу, мядзьведзь за малым не задраў твайго Юзюка“. — А Божэ ж мой Божэ, гэта кажэ, пэўне той самы і мяне спаткаўшы хацеў задраць; як зароў, дык аж я ў балота па шыю ўляцела“.

— „Гдзеж ты, кажу, яго спаткала?“

„На чортавай перэлазцы (гэтак звецца тая вываротня); ішла цябе спатыкаць, ці з двара да хаты клікаць“.

— „А я, кажу, ішоў да хаты і на тэй перэлазцы спаткаў мядзьведзя і спалохаў яго, дык ён у ручэй зваліўся“.

— „А можэ то я была?“

— „Вот, кажу, я бы цябе не пазнаў? То мядзьведзь быў пэўне. Вот ты дык можэ мяне спаткала, а не мядзьведзя“.

— „Але?! Нябось, кажэ, я добра прыгледзілася: і морда яго, і хвост кароценькі, і зароў, як трэба, аж засьмярдзела“...

— „А бадай цябе пярун спаліў! Давай, баба, бялізну змяніць!“

— Ну, так і будзе—нячыста сіла, думаю, нас абое у мядзьведзёў перакінула, а мы самі і ня ведалі; бо і чагож мне па мядзьведжаму раўсці, і ўсё рабіць як мядзьведзь са страху?..

Дык і хто яго ведае, ці відзіў я мядзьведзя, ці ня відзіў.

**Мацей Бурачок.**

# Дзядзіна.

Ну і дзядзіна у мяне была, а багатая дык багатая! — Было у яе сем маргоў зямлі, адна каза, сем хлявоў, тры гумны, а ўсе поўные: у адным мак, у другім так, а у трэцьцім цапы віселі. А як пойдзе, бывала, дзядзіна казу даіць, дык пакуль казу найдзе, аж у мазгі зайдзе; а як зачне яе даіць так нясуць малако цэбрамі, ведрамі, кадушкамі...

А масла дык білі на гумнішчы цэпамі і масьлянку у застаронкі зметалі; бедные людзі дык ішлі з мешкамі з гаршчкамі і з рэзгінямі: хто с чым прыйшоў, той с тым і пайшоў. А парсюкі кормные у дзядзіны дык такіе былі, што праз парог не маглі пералезьці; але над парогам дзірачка была, дык туды і лазілі!— А грэчка у маей дзядзіны калі зарадзіла! вот дару Божаго было! Калі налажылі стог на стаўпе каля прыпечку, дык вот быў стог! Але зрабілося нешчасьця: дзядзіна хусты прала, хтосьці дзьвярмі стукнуў, стог перавярнуўся ў начоўку і ратуначку не было!

Вось тут мая дзядзіна і зьбяднела. А тут дзяцей з асьміна, а карміць німа чым. Увідзіўшы гэта, панскі аліндар як прыстаў да дзядзіны: „прадай казу ды прадай". Ведаў, каб яго немач, што добрая каза!...—Дзядзіна думала, думала, глядзіць, што німа чым карміць, і прадала казу. Аліндар казу брацць, а каза ў лес на ўцекі, а воўк ды з лесу, ды яе за горла! Пакуль мы даляцелі, яна толькі крыкнула „Мааг-гда!" і зарэзаў яе воўк.

Ні так дзядзіне шкада было тэй казы, як жаль было таго, што каза і імя яе ведала...

**Мацей Бурачок.**

# Ігналева сякера.

Прыйшоў да пана селянін, Ігналь, прасіць аддаць яму сякеру, каторую атабраў ад яго лясьнік дворны, злавіўшы с хвойкаю у панскім лесі. У сенцах яшчэ зняўшы шапку і абцёршы нос, уходзіць у канцэлярыю, гдзе пан нешта пісаў, і с пакорай, чуць пераступіўшы парог кажэ:

— Пахвалёны Езус!...

— На векі! А хто там?

— Гэта я, паночку, Ігналь, той самы, што летась прыходзіў с кабылаю абгорываць бульбу, як панская Сіўка кульгала.

— Добра, добра!—А чаго-ж гэта, што скажэш?

— Хай панска ласка будзе ня гневацца... гэта я, паночку, прыйшоў да пана, як да збаўцы... ўжо такі ўсю праўду выскажу, як на талерку..

— Ну добра, добра! Дык чаго-ж ты хочэш? кажы!

— Паночку, запраўды, і сам ня ведаю, як гэта пачаць, каб ня збіцца с панталыку...

— А бадай цябе!... Гавары бардзей, бо, бачыш, часу німаю!

— Ніхай і так будзе! Каб гэта, паночку, хоць калі каму, хто, што і як, знарок ці не, мала-веля, якое, сякое, такое падумаў, сказаў ці зрабіў, дык яшчэ яно ведама было бы, як, скуль, калі што і да чаго! Але, паночку, каб я ні тых, ні сіх не агледаў, як я, нішто, ніяк, ніколі, нікому, нічога ніякага! А ён мне праз нішто, праз ніякае вун што!... І за што, паночку, ўсё тое?...

— Але што і да чаго ўсё гэта?...

— Ці-ж пан яшчэ не зразумеў?...

# Спісак беларускіх кніг.

Ведаючы цану кнігі найлепей прыслаць грошы наперад — гэтак таней каштуе перасылка. На кожные 10 кап. або іх часьці выстаўленай на кніжцы цаны трэба дабаўляць 2 к. на кошт перасылкі. Хто хочэ, каб кнігі у дарозе не прапалі, той павінен далажыць ешчэ 7 кап., каб кнігі былі высланы «Заказной пасылкай». Грошы да 1 рубля можна прысылаць маркамі у «заказным» пісьме. Хто выпісывае накладной платай (наложэным платежом), то перасылка каштуе даражэй: апрача платы ад вагі, почта бярэ ешчэ 7 кап. за «заказ» і 10 кап. за «налож. платеж», што узысківаецца з выпісаўшаго кнігу. Так, напр.: цэна кніжкі 12 кап., перасылка яе 4 кап., «заказ» і «налож. платеж» 17 кап., і вось такім парадкам кніжка у 12 кап. абходзіцца 33 кап.

Кніжкі азначеные *біс* — выйшлі і рускімі і польскімі літэрамі! лічбы азначаюць: першая цыфра—нумэр аддзелу, апошніе—нумэр чародны у данным аддзелі. Такім парадкам пры заказах заместа усяго загалоўка кнігі даволі напісаць нумэр, кнігі і нумэр каталогу, а калі кніга выдана і такімі і сякімі літэрамі—прыпісаць «рускімі» ці «лацінскімі».

| | | | Цэна руб. | кап. |
|---|---|---|---|---|
| | | **I. Да навучаньня.** | | |
| 11 | біс | Беларускі лемэнтар | — | 6 |
| 12 | біс | Першае чытаньне, Цёткі | — | 6 |
| 13 | | Другое чытаньне, Коласа | — | 25 |
| | | **II. Навуковые даступные для ўсіх.** | | |
| 21 | | Гутаркі аб небі і зямлі з рысункамі | — | 15 |
| 22 | біс | Цукер, В. Тройцы | — | 3 |
| 23 | біс | Гутаркі аб гаспадарцы | — | 3 |
| 24 | біс | Як ратаваць уздутую жывёлу | — | 3 |
| 25 | біс | Як бараніцца ад халеры | — | 1 |
| 26 | біс | Як рабіць добрые рамовые вульлі | — | 5 |
| 27 | біс | Зямельная справа у Новай Зэляндіі | | 3 |
| 28 | біс | Аб гаспадарцы на хутарох і шнурох | — | 5 |
| 29 | біс | Кароткая гісторыя Беларусі—Власта | — | 60 |
| 210 | | Беларусы і іх нацыональнае адраджэньне (распрад). | — | 5 |
| 211 | | Колькі слоў аб дзявочай опратцы на Беларусі | — | 5 |
| 212 | біс | Як ужываць штучны навоз | — | 2 |
| 213 | | Pčalina—żywiołka małaja, a karysci daje mnoha | — | 30 |
| 214 | | Як багацеюць чэскіе селяне | — | 10 |
| 215 | | Як выбіраць депутатоў у Гас Думу | — | 3 |
| 216 | | На дарозе да новаго жыцьця А. Новіны | — | 20 |
| 217 | біс | Ян Баршчэўскі Р. Земкевіча | — | 20 |
| 218 | | Рады для эмігрантоў, каторые едуць у Амэрыку | — | 25 |
| | | **III. Повесьці, апаведаньня прозай.** | | |
| 31 | | Дым. Конопніцкай | — | 4 |
| 32 | | Казкі | — | 6 |
| 33 | біс | Гэдалі, Э. Ожэшко | — | 6 |
| 34 | біс | Казка аб вадзе | — | 3 |
| 35 | | Архіп і Лявонка,—М. Горкаго | — | 8 |

| | | Цэна руб. | кап. |
|---|---|---|---|
| 36 | У дому лепей.—Новіча | — | 4 |
| 37 | Дзядзька Голад,—Віткевіча | — | 2 |
| 38 | «Маладая Беларусь». Сэрыя I-я сшытак 1-шы | 1 | — |
| 39 | «Маладая Беларусь» » » » 2-гі | 1 | — |
| 318 | «Маладая Беларусь», » » » 3 | 1 | — |
| 310 біс | Зборнік «Нашай Нівы» № 1 | — | 15 |
| 311 біс | » » » № 2 | — | 20 |
| 312 | Амэрыканец— А. Новіча | — | 10 |
| 313 | Бярозка і др.—Ядвігіна III | — | 5 |
| 314 | Беларускіе казкі | — | 5 |
| 315 | Хілібэртава пакута, Амфітэатрова | — | 5 |
| 316 | Апаведаньня—Тараса Гушчы | — | 10 |
| 317 | Abrazki—Zmitraka Biaduli | — | 15 |
| 318 | Вялікодная пісанка на 1913 г. | — | 30 |
| 319 | Колядная пісанка 1913 г. | — | 10 |
| 320 | Родные зьявы—Тараса Гушчы | — | 60 |
| 321 | Рунь—Максіма Горэцкаго | — | 40 |
| 322 | Якім бяздольны Пётры Беларуса | — | 15 |
| 323 | Раніца. Думкі беларускай студэнцкай моладзі № 1 | — | 10 |
| 324 | Miatawyje listočki | — | 5 |
| 325 | Нёмнаў дар—Тараса Гушчы | — | 6 |
| 326 | Тоўстае палена—Тараса Гушчы | — | 5 |
| 327 | Апаведаньня—Галубка | — | 6 |
| 328 | Праклёнышы—Л. Гвазда | — | 6 |
| 329 | Аб чым шэпацелі лісьця | — | 6 |

### IV. Вершы.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 41 | Вязанка, Я. Лучыны | — | 4 |
| 42 біс | Тарас на Парнасе | — | 5 |
| 43 | Дзед Завала, Ядвігіна III | — | 5 |
| 44 | Снапок зборнік вершоў А. Паўловіча | — | 15 |
| 45 | Адвечная песьня, абраз у XII зьявах Я. Купалы | — | 20 |
| 46 | Песьні жальбы, Якуба Коласа | — | 30 |
| 47 | Huślar, zbornik wieršou J. Kupały | — | 50 |
| 48 | Кацярына, Т. Шэвчэнка | — | 10 |
| 49 | Жалейка. Зборнік вершоў, Я. Купалы | — | 50 |
| 410 | Pan Tadeuš, A. Mickiewiča, pierek. Marcinkiewiča | — | 25 |
| 411 | Hapon, apowieść Marcinkiewiča | — | 15 |
| 412 | Wiečarnicy, apowieści Marcinkiewiča | — | 15 |
| 413 | Ščeroŭskije dažynki, Kupała. Marcinkiewiča | — | 20 |
| 414 | Dudka biełaruskaja. M. Buračka | — | 15 |
| 415 | Smyk biełaruski S. Reŭki | — | 20 |
| 416 | Batrak. Jak Jurka zabahacieŭ—Jakuba Kołasa | — | 10 |
| 417 | Pieśni—Ciški Hartnaho | — | 15 |
| 418 | Сон на кургане—Янкі Купалы | — | 50 |
| 419 | Čužyk Biełaruski, Haljaša Leŭčyka | — | 30 |
| 420 | Шляхам жыцьця—Я. Купалы, с партрэтам аўтора | 1 | 25 |
| 421 | Вянок, зборнік вершоў М. Багдановіча | — | 50 |
| 422 | Apawiedańnie i lehiendy wieršam | — | 25 |
| 424 | Прапаў чэлавек і др.—Якуба Коласа | — | 6 |
| 425 | Z rodnaho zahonu— A. Zlaziuli | — | 5 |

Цэна руб. кап.

### V. Беларускіе тэатральные творы.

| | | руб. | кап. |
|---|---|---|---|
| 51 | Модны шляхцюк, камэдыя у 1 дзеі. Каганца . | — | 25 |
| 52 | У зімовы вечэр, Абраз у 1 й дзеі Э. Ожэшко . | — | 30 |
| 53 | Хам. Абраз у 4-х дзеях, Э· Ожэшко . . | — | 70 |
| 54 | Сватаньне. Жарцік у 1-й дзеі, Чэхова . . | — | 25 |
| 55 | Мядзьведзь Жарцік у 1-й дзеі, А. Чэхова . | — | 30 |
| 56 | Міхалка. Камэдыя у І дзеі . . . . . | — | 35 |
| 57 | Па рэвізіі Абраз у 1 дзеі Кропіўніцкаго . | — | 35 |
| 58 | Пашыліся ў дурні. Жарт Кропіўніцкаго у 3 дзеях | — | 60 |
| 59 | Як яны жаніліся. Жарт у 1 дзеі А. Володськаго | — | 30 |
| 510 | «Паўлінка», камэдыя у 2 дзеях Я. Купалы . | — | 70 |

### VI Беларускіе музыкальные творы.

| | | руб. | кап. |
|---|---|---|---|
| 61 | Беларускі песеннік з нотамі . . . . . | — | 15 |
| 62 | Biełaruskije pieśni z notami I čaść. Sabraŭ A. Hryniewič . . . . . . . . | — | 30 |
| 63 | Biełaruskije pieśni z notami. II čaść. Sabraŭ A. Hryniewič i A. Ziaziula . . . . . | — | 25 |
| | Беларускіе песьні разложэные на 4 галасы; адна песьня у 4 галасох 10 к, кожны голас . . | — | 3 |
| 64 | Чамуж мне ня пець. 65 Ой ляцелі гусі 66 Дый куды-ж ты. 67 Ой пайду я лугма. 68 Ды ўжо сонейка. | | |
| 69 біс | А хто там ідзе? Я. Купалы, муз. Рогоўскаго . | — | 10 |

### VII. Рэлігійные.

| | | руб. | кап. |
|---|---|---|---|
| 71 | Karotki katechizm . . . . . . | — | 5 |
| 72 | Historyja Świataja z rysunkami . . . . | — | 15 |
| 73 | Bł. Andrej Babola mučynik . . . . . . | — | 5 |
| 74 | Alkahol . . . . . . . . . | — | 2 |
| 75 | Rady dla matak . . . . . . . | — | 3 |
| 76 | Kantyčka. Biez aprawy 10 k., u aprawie . . | — | 15 |
| 77 | Karotkaje wyjaśnieńnia abradoŭ R.Katalickaho kaśc. | — | 10 |
| 78 | Niekolki słoŭ ab pakucie . , . . . . | — | 5 |
| 79 | Žyccio papieža Piusa X . . . . . . | — | 3 |

### VIII. Гадавікі.

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 81 | Наша Ніва | 1906 г. | 1 р. | 00 к. | 75 | Наша Ніва | 1910 г. | 3 р. | — к. |
| 82 | » | » 1907 | » 15 | » — » | 76 | » | » 1911 | » 3 | » — » |
| 83 | » | » 1908 | » 10 | » — » | 77 | » | » 1912 | » 5 | » — » |
| 84 | » | » 1909 | » 3 | » — » | 78 | » | » 1913 | » 2 | » — » |

Календары 1910, 1911, 1912, 1913 па 10 к., 1914 г. па 15 кап.

**Беларускі календар і беларускіе кніжкі прадаюцца**

у Вільні, Завальная № 7.

## „Беларуская кнігарня“.

Кнігарням і кніганошам на правінцыі даюцца выгодные варункі і вялікая уступка.

## Прыймаецца перэдплата на

# „Маладую Беларусь“

### Зброніўі з аддзеламі:

1) Грамадзянскім, дзе разбіраюцца неадложные для бела, ускаго грамадзянства справы.

2) Навучным, з асаблівай увагай на навучнае пазнаньня Беларусі.

3) Прыгожаго пісьм… ства і штукі.

Выданьне друкуецца на добрай паперы, прыбранае вокладкай і застаўкамі –віньетамі у Беларускім стылю, а такжэ паводлуг патрэбы і магчымасьці — з малюнкамі.

Кожна кніжка друкуецца і такімі і сякімі літэрамі (рускімі і лацінскімі) па 160 страніц 8° вялікаго фармату.

Быць супрацоўнікаам „Маладое Беларусі“ абецаліся нашы беларускіе песьняры і публіцысты, а такжэ вядомые вучоные і прафэсары.

Перэдплата прыймаецца на сэрыю (4 кніжкі)—с перасылкай 3 рублі.—Без прэдплаты кожна кніжка па 1 рублю. Вышлі ужо з друку 3 кніжкі.

Адрэс выдавецтва „МАЛАДАЯ БЕЛАРУСЬ“:

С.- Петербургъ, Издательство «Загляне сонцэ і ў нашэ ваконцэ», В. О. 4-я лінія, д. 45., кв. 16.

Т. м жэ прыймаюцца абвесткі для памешчэньня ў «Маладую Беларусь»

AD PACZATKU 1913 HODU wychodzić u Wilni

TYDNIOWAJA KATALICKAJA HAZETA

# „BEŁARUS“

niasie jana sztotydzień wiaskowamu biełarusu-kataliku u jaho rodnaj mowie żywoje katalickaje

SŁOWA PRAŬDY, - - - PACIECHI. - - - AŚWIETY.

kasztuje na hod 1 r. 50 k. na 6 mieś. 80 k. Asobny № 3 kap., s pieras 5 k.

Chto chocze zaznajomicca z hazetaj „BIEŁARUS“—chaj padaść swoj adres, dyk Redakcija paszle jamu **na probu** adzin-dwa numery hazety—**darma**.

Adres Redakcii i kantory:
WILNIA, Wilenskaja wulica 18—6.

# Магазын срэбных і платэраваных вырабоу

## фабрыкі

# ЯЗЭПА ФРАЖЭ

## з Варшавы

**у Вільні на Вялікай вуліцы № 58**

**суліць акуратна дабраные сталовые заставы (сэрвісы), як:**

Нажы, Відэльцы, Ложкі, Ложэчкі і т. д. гладкіе і сталовые у наймацнейшые узоры, а таксама:

Самавары, Імбрычкі, Цукерніцы, Заставы (сэрвісы) да Воцэту, аліўы і лікероў. Пастумэнты, Піраміды і Кошыкі да фруктоў і цеста.

Тацы, Паўміскі, Рондлі і Вазы да зупы, Вазоны да віна і крушону, Масьляніцы. Компотьеры, Жардзіньеры.

Кандэлябры, Ліхтары, Люстры, Шчоткі і іншые туалетные рэчы

**а так сама уселякіе галянтэрные рэчы, што вырабляюцца у ф. брыцы.**

*P. S.* Магазын у Вільні нідаўна адчынен дзеля таго, каб Паважаные Пакупцы маглі дастаць праўдзівы тавар с фабрыкі „Фражэ“, а не падрабляны, нічога неварты, толькі з выгляду падобны да праўдзіваго, бо шмат дзе ў апошніх часах пачалі прадаваць фальсіфікаты заместа вырабў з маей фабрыкі.

# Што пішуць расейцы, палякі і украінцы аб „Беларускім Календары“.

Прэфэсар Погодін у № 12736, „Биржев. Вѣд.“ 1912 г. пішэ:

*„Нашимъ издателямъ календарей для народа слѣдовало бы обратить вниманіе на ежегодные календары выпускаемые „Нашай Нівой“.* Въ польской печати мнѣ приходилось встрѣчать сочувственные отзывы объ этихъ превосходныхъ книжкахъ, а въ нашей же печати онѣ—прошли какъ то незамѣченными. Эти календари представляютъ настоящую культурную работу. Кромѣ общихъ календарныхъ данныхъ, они даютъ массу свѣдѣній полѣзныхъ въ крестьянскомъ быту: мы находимъ здѣсь и юридическій отдѣлъ (земскій начальникъ, уголовные дѣла въ волостномъ судѣ, формы прошеній на разные случаи, цѣна гербовыхъ марокъ и т. п.) Совѣты для хозяевъ охватываютъ область крестьянскаго земледѣльческаго хозяйства, скотоводства, мелкаго кредита и т. п. Нѣсколько страницъ посвящено коопераціямъ (кредитнымъ, кооперативнымъ лавкамъ), далѣе свѣдѣніямъ о разныхъ болѣзняхъ людей и животныхъ и т. д. Много стиховъ, маленкихъ расказовъ; однимъ словомъ, въ крестьянскомъ быту эта книжка должна представлять большую цѣнность. Разумѣется, этому дѣлу, чуждому шовинизма и мелкаго политиканства, нельзя не сочувствовать всѣй душой».

У „Dzieniku Petersburskim“ 1911 г. пісалося аб беларускимъ календары „Wydaje go już po raz trzeci w Wilnie tamtejše czasopismo białoruskie „Nasza Niwa“. Powiedzmy z góry: **układ i treść wydawnictwa,** niemal wyłącznie dla ludu wiejskiego. **mogą za przykład służyć** — zrozumienia najpilniejszych tego ludu potrzeb oraz tego, co istotnie ten lud zająć może.

„...Kalendarz białoruski nie zawiera zgoła żadnych akcentów wojującego nacjonalizmu. Bardzo to szlachetny i obywatelski rys cechujący z resztą wszystkie dzisiejsze wydawnictwa białoruskie.

Układ i opracowanie „Kalendarza“—wzorowe. **Wydawnictwa anologicznego,** tak znakomicie trafiającego — nauką i rozrywką w poziom umysłowy, oraz w duchowny nastrój ludu wiejskiego — **nie posiadamy.**

У «Kurjery Wileńskim» № 161 1911 г. пісалося:

„Biełaruski Kalendar Naszaj Niwy“ wydawany w Wilnie od lat trzech przez redakcję jedynego pisma białoruskiego, **został dobrze przystosowanym do potrzeb** włościan – białorusinow“.

Украінская газэта «Рада» пісала аб Беларускім Календары так:

„Беларускі Календар—гэта найлепшы с паміж календароў для вёскі. Добра абдуманы і уложэны, прыгожа выданы і танны.

У „Виленск. Вѣстн.“ № 2548, 1911 г. было надрукавана так;

„Передъ нами „Беларускі Календар“ на 1912 г., изданія „Нашай Нівы“. Надо отдать дань справедливости составителямъ его: календарь прекрасно приноровленъ къ потребностямъ деревни; подборъ статей абдуманный и тщательный“

**Беларускі Календар** адзначэн сярэбраным медалям на Быхоўскай Сельска-Гаспадарскай выстаўцы у 1911 гаду Пахвальным лістомъ на сельск.-гасп. выстаўцы w 1912 г. у Леплі (Вітэб. губ.). Пахвальным лістом у 1913 г. на выстаўцы у Гарадку (Вілейск пав.) Пахвальным лістом у 1913 г. на выстаўцы у Глыбок.м (Дзіс. пав.)

# Беларуская кнігарня

**Вільня, Завальная, № 7.**

Вядзе агульніцкі і дробны гандэль беларускімі кніжкамі, дастаўляе кніжкі аб Беларусі у другіх мовах, прыймае да друкаваньня рукапісы.

Кніжкі беларускіе кнігарня высылае і накладной платай. Хто выпісывае накладной—платай аплачывае за накладную плату 10 к. і за «заказ» 10 кап. звыж перасылкі. Прыймаецца падпіска на газэты.

Гендлярам Беларуская кнігарня дае вялікую уступку.

**БЕЛАРУСКАЕ**

## Выдавецкае Таварыства у Вільні

прыступаючы да выдавецкай [illegible] паведамляе усіх, каму дорага справа беларускаго адраджэньня, аб тым, што таварыства ставіць сабе мэту у першы чарод выпускаць у сьвет па сіле магчымасьці такіе кнігі:

**Пісьмо сьвятое цэлае, Эвангелічку на сьвяты і нядзэлі, Гісторыю касьцёла для школ, Грамтыку беларускую, Географію, слоўнікі, Арытмэтыку, Кнігі для навучаньня у школах, Кнігі популярные аб сельскай гаспадарцы. Выдавецтва звертаецца с просьбай да шаноўных пісьменьнікоў прысылаць як можна найхутчэй свае рукапісы вышэй азначэных кніжэк.**

Адрэс: Вільня, Каштановая № 5, кв. 4., Беларускае **Выдавецкае Таварыства.**

3-ці год выдавецтва

# „САХА“

Першы сельска гаспадарскі Белар...

„Саха“ на Віленскай гаспадарскай выстау... за стацьці свае атрымала србны мэдал...

Падпісная цэна с перасылкай: на ... мо...

на 6 м.—60 к. Цэна асобнай ...

Падпіска прымаецц...

Адрэс Рэдакцыі: Мінск, За...

Рэд...

1984

Прыймаецца падпіска на 1915 год на беларускую газэту

# „НАША НІВА“

**ГОД ВЫДАВЕЦТВА X.**

«НАША НІВА» [illegible] гады будзе працаваць над адраджэньнем Беларусі, шырыць беларускую сьведомасць, бараніць інтэрэсоў [illegible]наго беларускаго народу.

«НАША НІВА» у публіцыстычным аддзелі друкуе стацьці на палітычные, экономічные і національные тэмы, лепшых беларускіх публіцыстоў; у бэлетрыстычным аддзелі дае апаведаньня, сцэнічные творы і вершы, лепшых бэлетрыстоў і паэтоў. Апрача гэтаго дае многа вестак з жыцьця на Беларусі і з усіх старон. У вясковым жыцьці «НАША НІВА» заменяе сабой штодзевную часопісь.

Цэна «НАШАЙ НІВЫ» на год с перасылкай—2 р. 50 кап.; на поўгода—1 руб. 25 кап; на 3 месяцы—65 кап.

**Усе, каму дарага справа адраджэньня беларусоў да культурна-національнаго жыцьця, выпісывайця, чытайця і шырця „НАШУ НІВУ“.**

Адрэс радакціі: [illegible] **Віленская 29.**

# „ЛУЧЫНКА“

**Літэратурна-навуковы месячнік Беларускай Моладзі.**

Выходзіць што месяц кніжкамі ад 32—48 стр. у кожнай; Падпісная цэна с перасылкай: на 1 год 2 р.; на 6 м.—1 р. на 3 м.—50 к. Цэна асобнай кніжкі—15 к.; с перасыл.—17 к.

**[...]піска прыймаецца с кожнаго месяца.**

[...]цца і аткрыткай, просячы, каб падпісную [...]пажылі на першы высланы нумар.

[...]акціі: *Мінск, Захарэўская вул. № 24.*

[...]ом [...]эдактар-выдавец А. Ўласоў.

Бел. аддзел
1994 г.

B0000000223909